Аліна Вайцанюк

КРУГАГОД

Падручнік беларускай мовы

для 3 класа

Мастацкае афармленне

Міраслаў Зграйкоўскі

KRUHAHOD

Podręcznik do nauki języka białoruskiego
dla kl. 3 szkoły podstawowej

Opracowała
Alina Wawrzeniuk

Okładka, ilustracje
Mirosław Zdrajkowski

Redaktor techniczny
Adam Pawłowski

Podręcznik dopuszczony do użytku szkolnego przez ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania i wpisany do wykazu podręczników przeznaczonych do kształcenia ogólnego dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym do nauczania języka białoruskiego na poziomie klasy III szkoły podstawowej na podstawie opinii rzeczoznawców dr Jadwigi Głuszkowskiej-Babickiej i prof. dr. hab. Mieczysława Jackiewicza.

Numer ewidencyjny 634/3/2014. Rok dopuszczenia 2014.

Podręcznik jest finansowany przez Ministerstwo Edukacji Narodowej.

ISBN 978-83-934208-4-1

© Copyright by Stowarzyszenie „AB-BA”
Białystok 2014

STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI
I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA”
15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8
www.ab-ba.com.pl

Wydanie pierwsze

Drukarnia
INTROPACK JERZY IWANIUK

Я ўжо трэцякласнік

За вучобу



Адшумела лета
Каласамі,
Адспявала ў пушчы
І ў бары.

Клас заліўся звонка
Галасамі,
І за партай селі
Мы, сябры.
Празвінеў званок
Ранютка-рана,
І адразу
Клас увесь заціх.



Будзем мы вучыцца
Ўсе старанна,
Слухацца
Настаўнікаў сваіх.

Авяр'ян Дзеружынскі



???

1. Калі вучні вяртаюцца ў школу?
2. Як будуць яны вучыцца?
3. Каго яны будуць слухаць?

4. Разгледзь свой падручнік па беларускай мове.
Запішы адказы на пытанні:
Які загаловак падручніка па беларускай мове для III класа?
Хто аўтарка падручніка?
Хто намаляваў ілюстрацыі да гэтага падручніка?

Пасля канікулаў



О, час канікулаў вясёлых,
о, хуткаплынны лета час,
бывай, бывай!
Дабрыдзень, школа!
Ці ты пазнала сёння нас?



Мы ўсе за лета загарэлі
і трошкі нават падраслі,
штодня марожанае елі,
і дзе мы толькі не былі!
І забаўлялі нас арэлі,
і выпрабоўвалі палі.

Нас сонца раненька будзіла,
з сабою дзень працоўны браў,
нам у сваёй старонцы мілай
хапала ўсім цікавых спраў.



Пара канікулаў вясёлых
прайшла імкліва,
і цяпер
сябры сышліся.
Зноўку, школа,
вітаем радасна цябе.

Васіль Жуковіч

??? 1. Якім быў час канікулаў?
2. Што рабілі дзеці ўлетку?
3. Які настрой у школьнікаў пасля канікулаў?

4. Запішы адказы на пытанні:
Дзе ты была ў (быў у) час канікулаў?
Што ты рабіў (рабіла) летам?

Ветлівыя словы



Скончыліся ўсе ўрокі.
Вучні ўзялі свае заплечнікі і пайшлі апранацца.
Выйшлі з раздзявальні і пачалі развітвацца. Усе дружна сказалі настаўніцы:
— Да пабачэння!
У адказ пачулі:
— Да пабачэння. Усяго добрага.
Юрка прамовіў:
— Бывайце.
Марыля сказала:
— Да заўтра.
Іншыя школьнікі гаварылі:
— Да сустрэчы.
— Пакуль.
— Бывай.
І пайшлі дадому.

1. Якія словы ўжываюць людзі пры развітанні?

2. Якімі словамі людзі вітаюцца? Запішы іх у сшытак.

Давайце пазнаёмімся



На пляцоўцы ў парку гулялі хлопцы і дзяўчаты.
Да іх падышоў незнаёмы хлопец. Ён хацеў пазнаёміцца з дзецьмі і пагуляць з імі.

1. Што ён ім сказаў?
2. Што яму адказалі дзеці?
3. Як трэба знаёміць сваіх сяброў?



Вольга Іванюк
працуе ў школе.
Яна – настаўніца.



Алесь вучань.
Хлопец вучыцца
ў III класе.



Аня – вучаніца трэцяга класа.
Яна – добрая дзяўчынка.

4. Запішы адказы на пытанні: Як цябе завуць? Колькі табе гадоў? У якім класе і ў якой школе ты вучышся?

Дарога ў школу



1. Разгледзь малюнак.

2. Адкажы на пытанні: Дзе ты жывеш? Дзе твая школа? Як ты дабіраешся ў школу? Пра што трэба памятаць на дарозе?

3. Дапоўні сказы:

Юрка ў школу хутка едзе на сваім ..... .

Да чакання я прывык, бо спазняецца ..... .

За ракою Віцеў дом. Завязе яго ..... .

Свой заплечнік забірай, завязе цябе ..... .

Нешта шэпча шына шыне. Еду ў школу на ..... .

Непатрэбны жарты, смешкі, бо я ў школу іду ..... .

4. Запішы, як ты дабіраешся ў школу.



Пачакаем да панядзелка

Алінка прыбегла са школы і, падняўшы руку з растапыранымі пальцамі, абвясціла:

– Пяць з плюсам!..

– Малайчына, – пахваліла мама.

– А такія адзнакі ставяць? – усміхнулася бабуля.

– Пакажы сшытак.

Аднак Алінка не паказала бабулі сшытак. Адвяла яе ўбок, шапнула на вуха:

– Толькі пяць. Плюса няма.

– А навошта ты хлусіш? Пяцёрка і так, без плюса, выдатная адзнака...

Гэта было ў пятніцу. А ў нядзелю Алінка прыбегла да бабулі, ледзь не плачучы:

– Палавіна сумкі прапала.

– Зноў «пяць з плюсам»? – усміхнулася бабуля.

– Ды не! Пачала рабіць урокі, а кніжак, алоўкаў, пенала няма. Прапалі недзе.

– А ты добра праверыла?

– Не адзін раз. Скралі, не інакш.

– Хто ж мог скрасці ў класе? Кожны мае свае кніжкі і алоўкі.

– Я думаю, гэта Жэнька. Нездарма ён дзівіўся на мой пенал...

– Пачакай, пачакай... Можа, ты спяшалася і не ўсё паклала ў сумку пасля званка?

– Усё!.. Жэнька ўзяў – больш ніхто.

– Не кажы, калі добра не ведаеш, – не паверыла бабуля.
– Не, я ўпэўнена – ён, – настойвала Алінка.
– Пачакаем да панядзелка, а там паглядзім...

У панядзелак бабуля разам з унучкай пайшла ў школу. У раздзявальні Алінка ўбачыла аднакласніка Віцю і не змагла прамаўчаць.

– А ў мяне палавіна сумкі прапала!
– Як гэта – палавіна сумкі? – здзівіўся Віця. – Хіба яе распілавалі?
– Не сумку распілавалі, а палавіну рэчаў забралі...

Віця падхапіў навіну, з крыкам паляцеў па калідоры.

– А ў Алінкі палавіну сумкі скралі!
– Навошта ж ты гаворыш абы-што, – папракнула ўнучку бабуля. – Пойдзем праверым тваю парту.

У класе нікога не было. Алінка падбегла да парты. Падняла вечка і развяла рукамі ад здзіўлення: «скрадзеныя» рэчы ляжалі на сваім месцы.

Падышла бабуля:

– Бачыш! А ты сказала – Жэнька...

А з калідора далятаў Віцеў голас:

– У Алінкі сумку скралі...

Алінка не ведала, куды схавацца ад сораму.

Леанід Прокша

1. Што ты можаш сказаць пра Алінку?
2. Хто ёй дапамог знайсці згубленыя рэчы?
3. Чаму Алінка не ведала, куды схавацца ад сораму?
4. Растлумач загаловак твора.

5. Знайдзі ў тэксце назвы школьных прылад.

Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанне *што*?, называюцца **назоўнікамі**: *парта, дзверы, стол, дошка, паліца, акно.*

6. Запішы ў сшытку, якія прылады неабходныя ў заплечніку кожнага вучня.

Дружны клас



Міхась дрэнна адчуў сябе ў школе. У яго пачаўся кашаль і катар. У хлопца таксама паднялася тэмпература. Ён захварэў. Не пайшоў у школу.

Аня і Воля прыйшлі наведаць яго. Сяброўкі пагрукалі ў дзверы.

– Добры дзень, – павіталіся дзяўчаткі. – Прабачце, калі ласка! Мы да Міхася.

– Калі ласка, заходзьце, – запрасіла Міхасёва мама.

Дзеці перадалі Міхасю хатнія заданні.

– Дзякуй вам! Я ўжо неўзабаве прыйду ў школу, – сказаў хлопчык.

– Да пабачэння, Міхаська! Папраўляйся!

Міхась быў рады. Добрыя ў яго сяброўкі!

паводле Паўла Шубы

1. Што здарылася з Міхасём?
2. Якія былі прыкметы хваробы?
3. Што вырашылі зрабіць Аня і Воля?
4. Што дзяўчаткі перадалі Міхасю?
5. Чаго жадалі сяброўкі свайму аднакласніку?

Літару **ў** пішы пасля галосных.

6. Прачытай тэкст з падзелам на ролі.

7. Выпішы з тэксту словы з **ў**. Падзялі іх на склады.

Выбары старасты



Хто галоўным будзе нашым?
Хто найлепшы з нас усё ж?
Можа, Воля, можа, Саша –
хто з іх самы-самы?.. Хто ж?
Наша ўлада, наша воля –
выбраць старасту сабе.
Але надта ж крыкса Воля,
Саша – стукне па ілбе...
І за іх не горшы Лёнік.
Вось нядаўна выйграў крос,
піша ўсе заданні ў дзённік,
задзірае рэдка нос.
Самы сціплы хто ў нас сёння –
задаецца хто ледзь-ледзь?
Хоць нашто ён нам – ціхоня?
Будзе толькі чырванець...
Да ўсяго, напэўна, здатны
весялун найбольшы – Клім.
Рослы, бойкі, акуратны,
але трохі падхалім.
– Лёня хай! Спартсмен-разраднік...
Што спрачаецеся вы!
Хай сабе і не выдатнік –
абы хлопец дзелавы!

Мар'ян Дукса

Імёны і прозвішчы людзей, назвы краін, гарадоў. вёсак, рэк, азёр, клічкі жывёл пішуцца з вялікай літары: *Алена Ладуцька, Польшча, Бельск-Падляшскі, Орля, Нарва, Свіцязь, Рэкс.*

1. Каго выбіралі вучні?
2. Якія былі кандыдаты?
3. Што можаш сказаць пра Волю, Сашу, Лёніка і Кліма?

4. Назаві рысы характару добрага старасты.

Абавязкі вучня

Дзіравая памяць



Толькі я сеў піць чай ды есці гарачыя аладкі, як убачыў свае чаравікі. Бабуля зноў іх не пачысціла. І я крыкнуў:

– Бабуля!

– Што здарылася?

– Скажы, што ты сёння забылася зрабіць?

– Падручнікі твае знайшла, сабрала, – пачала пералічваць бабуля,

– Штаны адпрасавала. У партфель тры яблыкі паклала...

– Эх, бабуля! Сам не скажу, дык не ўспомніш. Бачыш, чаравікі не начышчаныя! Як ты магла забыцца?

– Ох, старая, зусім страціла памяць. Пякла аладкі, а пра чаравікі забылася. Зараз, унучак, зараз.

Бабуля зняла з маіх ног чаравікі і пачала іх чысціць.

Я з'еў тры аладкі, дапіў чай. А бабуля ўсё чысціла мае чаравікі. Ну і марудлівая!

Ой, у школу спазнюся. Бабуля нешта крыкнула мне ўслед, але я не пачуў за дзвярамі.

Паспеў! Ускочыў у клас, а ўсе ў класе чамусьці смяяцца пачалі. Выцер я пот з твару, зірнуў на ногі і жахнуўся: у адных шкарпэтках прыбег у школу. Ну, бабуля, пачакай. Чаравікі пачысціць пачысціла, а на ногі мне абуць забылася. Вось дзіравая памяць!

Мікола Капыловіч

1. Што думаеш пра гэтага хлопца?
2. Што можна сказаць пра бабулю?
3. Чаму дзеці смяяліся з хлопчыка?
4. На што мае права кожны вучань?

5. Выпішы ўсе словы, якія адпавядаюць на пытанне: Што рабіў хлопчык?

6. Назаві вучнёўскія абавязкі.

Робат

Робат свой
сігнал падаў –
прачнуўсія
гаспадар.
Ежу
робат падагрэў.
Гаспадар
папіў, паеў.
На работу
паспяшаў.
Робат дома
працаваў.
Фортку
адчыняў рукой
і праветрываў
пакой.
А прыходзіў
гаспадар,
электрычны
сакратар,
як належыць,
гаварыў,
хто званіў
і што прасіў.
Робат хутка
ўсё рабіў,
памагатым
добрым быў.

Авяр'ян Дзеружынскі



1. Ці хочаш набыць такога робата? Чаму?

2. Запішы, што рабіў робат з верша.
3. Запішы, што рабіў уласнік робата.

Восень-гаспадыня

Надыход восені

Вось і лета сышло,
Адспявала калоссе,
Цяжка нам заўважаць,
Як з'яўляецца восень.

Непрыкметна зусім
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
памахае буслiным.

А пасля,
А пасля
Ліст апошні сарвецца...
Ды не знаю, чаму
Ты мне, восень, па сэрцу!

Пятрусь Броўка



1. З якім пачуццём аўтар верша піша пра восень?
2. Якія прыкметы восені апісаныя ў вершы? Прачытай.
3. Што такое «бабінае лета»?
4. Як разумееш словазлучэнне «залатая восень»?
5. Што восень мяняе ў прыродзе? Раскажы.
6. Ці ты любіш восень?

Восень шыла фартушок



Задумала Восень сабе абнову пашыць... І перш за ўсё выбрала залацістыя і чырванаватыя колеры: яны ёй больш да твару. Ціха хадзіла палямі, пералескамі і падбірала сабе на фартушок то трохі чырвані, то залацінак, што свяціліся ў лістоце дрэў. І асіны, і грушы ажно чырванелі ў промнях ціхага сонца, а клёны і бярозы залаціліся сваімі кронамі на ўзлессі.

«Добра было б пацеркі падабраць», – падумала Восень і ўбачыла рабіну. Гронкі яе наліліся чырванню, цяжка звісалі долу. Чым не пацеркі?

А потым Восень яшчэ збірала дробненькія сінюткія кветачкі верасу, сціплых сухацветаў . А ў кужэльную касу сваю ўпляла трапяткія белыя павуцінкі...

– Цяпер, здаецца, усё, – сказала Восень і паглядзела ў круглае люстэрка – шырокае азярцо.

Міхась Даніленка

1. Што задумала зрабіць Восень?
2. Якія колеры выбрала яна на фартушок?
3. Дзе яна іх знайшла?
4. Што яшчэ збірала Восень?

5. Намалюй Восень у абнове.

Закружыліся лісточкі

Ліставыя дрэвы:



бяроза



дуб



таполя



ліпа



клён



ясень

Хваёвыя дрэвы:



яліна



лістоўніца



сасна



піхта

Думкі



Паўпадалі з дрэваў жоўтыя лісточкі. Залацістым дываном разаслаліся па зямлі.

Ляжаць спакойна.

Скуль узяўся, наляцеў лёгенькі ветрык; ускалыхнуў, заварушыў іх, пачаў кружыць, уверх падкідаць памаленьку, забаўляючыся. Пасля крыху мацней ды мацней. Нарэшце сабраў усю сваю сілу; ухапіў цэлую хмару жоўтых лісточкаў, закруціў, пагнаў высока, – гэй! – аж пад неба... кінуў аб зямлю. Зноў пагнаў далей з енкам, свістам, стогнам...

Ляцяць лісточкі. Ляцяць цэлым курывам. Ударацца адзін аб аднаго і ляцяць. Няма ім супачынку.

Бедныя лісточкі!..

Зоська Верас

1. Якога колеру восеньскія лісткі?
2. Як яны ляцяць?
3. Чаму аўтарка назвала іх беднымі?

4. Якія дрэвы растуць побач з тваёй школай? Запішы.

5. Намалюй восеньскі лісток. Запішы, з якога ён дрэва.

У грыбох



Пад нагой хрумсціць ігліца
І шуміць смалісты бор...
Сыраежкі і лісіцы –
Усе нібы на падбор.

Але іх мы абмінаем:
Надта многа ўжо такіх.
Хмызнякамі мы блукаем
І бярэм баравікі.

Падасінавікі ўбачым –
Іх падрэжам на камлі.
Вось удача дык удача –
Нездарма сюды прыйшлі.

То на ўзгорак, то з узгорка –
Як прыгожа у бары!
Скача спрытная вавёрка
Па галінках угары.

Поўны кошыкі! Даволі!
Нам дамоў збірацца час.
Хай расце грыбоў тут болей –
Прыйдзем мы па іх не раз!

Алесь Ставер

1. Пра якія грыбы піша аўтар верша?
2. Што можна зрабіць з грыбоў?

3. Якія іншыя ядомыя грыбы можна знайсці ў бары або ў лесе? Запішы.

Ядомыя грыбы



баравікі



апенькі



падасінавікі



парасонікі



рыжыкі



падбярозавікі



лісічкі



махавік



сыраежкі

Як людзі навучыліся есці бульбу

Можа вы не ведаеце, што бульба, якую мы цяпер ямо штодзень, пару соцень год таму была зусім невядомай у нас раслінай. А калі бульбу пачалі прывозіць з-за мора, з Амерыкі, то яна была такая дарагая, што мала хто мог яе купіць.

Аднаго разу здарылася, што багаты пан купіў гэтае заморскае дзіва і загадаў агароднiку пасадзіць яго старанна ў пульхную зямлю.



І вось выросла зялёная сцяблінка, а на ёй неўзабаве зацвіў прыгожы белы цвет.

– Калі гэты цвет звяне, – падумаў сабе агароднік, – тады, напэўна, з’явяцца прыгожанькія плады.

Так яно і было. Паміж лісточкамі на жаўтаватым сцябле выраслі зялёныя цвёрдыя шарыкі. Яны былі велічынёю як арэх, а пад скуркай у іх было насенне.

– О, якія прыгожыя, – усцешыўся агароднік, – вось жа будзе смачная страва.

Ён сарваў зялёныя арэшкі, а кухар зварыў іх, паліў алеем і багата пасыпаў цукрам. Запрасілі гасцей на банкет, але нагатаваная ежа была горкая, цвёрдая, і ніхто не хацеў яе есці.

Узлаваўся пан, загадаў развесці вялікі агонь, вырваць расліну з карэннем і знішчыць яе раз назаўсёды. Але што за чары! Калі вогнішча астыла, знайшлі ў попеле бурыя клубні, мяккія і смачныя.

– Ага, я ўжо ведаю! – сказаў агароднік, – гэта не вяршкі трэба есці, толькі клубні.

Цяпер ніхто ўжо, напэўна, не памыліцца і не зварыць супу з маленькіх зялёных плодзікаў бульбы.

Паводле Валянтыны Пашкевіч

1. Адкуль з’явілася ў нас бульба?
2. Якую памылку зрабіў агароднік?
3. Якой аказалася новая страва?
4. Што загадаў пан?
5. Якую частку бульбы трэба есці?
6. Якія стравы робяць з бульбы?

Гаспадарыла сонца на градках

Колькі дзіваў на градках ля хаты
Нінка ўбачыла летняй парой!
Ловіць сонца сланечнік цыбаты,
Залатою трасе барадой.

Як вужака, па тычцы да сонца
Струкавы узбіраецца боб.
І гарбуз прыпякае бясконца
Аграмадны, бліскучы свой лоб.

Ад спякоты, як крот на загоне,
Закапаўся ў зямлю бурачок.
Пад зялёным схаваў парасонам
Прыгажосць чырванеючых шчок.

На адной ножцы дрэмле капуста,
Вяла ўніз апусціўшы лісты.
Агурок выграваецца тлусты,
У кароне стаіць мак густы.

Блузак шмат апранула цыбулька,
Хоць і сонца праменьчык прыпёк.
Грэе плечы ў цяпле, як бабулька,
Побач дзедка сівенькі – часнок.

Шмат на градках і дзіваў, і чараў
Заўважыла Нінка кругом.
Дбайна сонейка тут гаспадарыць,
Напаўняе прыроду жыццём.

Віктар Швед



1. Якія дзівы ўбачыла Нінка?
2. Якая агародніна расла на градках?
3. Чаму карысна есці агародніну?

Чаму цыбуля горкая



Прывёз дзед з горада насенне цыбулі. Падае поўны мяшэчак бабцы і кажа:

– На, бабка, пасей на градцы. Будзе ў нас салодкая-салодкая цыбуля.

Пасеяла бабка цыбулю і ўзяла палівачку, каб паліць градку. Тут прыбегла Анютка і просіць:

– Бабулька, дай я пасаджу хоць адно зярнятка.

Пачала бабка зярнятка ў мяшочку шукаць. Няўжо не засталося? Не. Ніводнага не знайшла.

Горка заплакала Анютка. Слёзы ліліся з яе вачэй на градку, як вада з бабульчынай палівачкі. Цыбулю і паліваць не прыйшлося.

Калі ўзышлі першыя парастачкі, дзед, бабка і ўнучка прыйшлі ў гарод маладой цыбулі пакаштаваць. Сарваў дзед зялёнае пёрка, адкусіў ад яго. А цыбуля такой горкай аказалася, што дзед ледзь не заплакаў.

Гэта ад горкіх Анютчыных слёзак яна горкай стала.

Алена Кобец-Філімонава

???

1. Якія героі выступаюць у гэтай казцы?
2. Што прывёз дзядуля?
3. Хто пасеяў цыбулю?
4. Хто яшчэ хацеў пасадзіць цыбулю?
5. Чаму Анютка плакала?
6. Якой аказалася цыбуля? Чаму?

Яблыкі

У кошыку яблыкі
Розных сартоў.
Я назваў іх.
Ты слухаць гатоў?
Пепін, шафран,
Баравінка,
Цітаўка, крымка,
Пуцінка,
Цыганка, антонаўка,
Белы наліў,
Штрыфель, ранет,
А вось гэты забыў.
Мама на яблык зірнула:
Каштэлі.
Дзеці з ахвотаю
Яблыкі елі.

Ніна Галіноўская



1. Пра якія сорты яблыкаў піша аўтарка верша?
2. Ці ведаеш іншыя сарты? Пашукай іх у інтэрнэце.
3. Чаму карысна есці яблыкі?
4. Якая іншая садавіна расце ў нашых садах?
5. Якую садавіну любіш есці?
6. Дзе яна расце?

Словы, якія абазначаюць назвы садавіны і агародніны і адказваюць на пытанне *што?* - гэта **назоўнікі**.

Лістапад



У садах, у полі чыста.
Дождж ліецца як праз сіта.
Хмары ў небе шчыльнай сеткай,
Прапускаюць сонца рэдка,
А яно цяпер так нізка.
Свішча ў коміне вятрыска.
Лісцік скручаны, счарнелы
Вяла коціцца, нясмела.
Дзень санлівы і кароткі.
Вераб'ёў снуюць чародкі
Ды імкнуцца да жытла –
Хочуць ежы і цяпла.

Ніна Галіноўская

1. Які настрой гэтага верша?

2. Адшукай у вершы радкі, якія пра гэта сведчаць. Прачытай.

Лістапад – апошні месяц восені, перадапошні месяц года. Дзень кароткі. Часта зямлю засцілае туман. Апошнія лісткі падаюць з дрэў. Здараюцца прымаразкі. Адлятаюць апошнія чароды дзікіх качак. Некаторыя звяры збіраюцца ў зімовую спячку.

3. Якое надвор'е ў лістападзе?

4. Запішы назвы восеньскіх месяцаў.

5. Растлумач, ад чаго пайшлі гэтыя назвы.

Дзяды

Дзяды спраўлялі ў пэўныя дні, дзе-нідзе па некалькі разоў на год, часцей увесну і ўвосень. Галоўнымі былі для праваслаўных беларусаў Веснавыя Дзяды – Радаўніца (Провады). Беларусы святкуюць таксама Дзмітраўскія Дзяды.

На Дзяды гатавалі рытуальныя стравы (7 і больш няцотных святочных і абрадавых страваў). Абавязковаю з іх была куцця. Паводле звычаю, ад кожнай стравы ў асобны посуд адкладвалі па кавалачку для нябожчыкаў і пакідалі нанач: лічылася, што душы памерлых продкаў, якія прыходзяць на Дзяды, трэба пачаставаць.

А пасля вячэры са стала не прыбіралі — для таго, каб памерлыя маглі за ім пасядзець у цішыні.

У пачатку лістапада адзначаем свята Восеньскія Дзяды. Гэта памінальны дзень, дзень продкаў. У той час успамінаем тых, якіх ужо няма сярод нас. Прыбіраем магілы нашых блізкіх. Носім кветкі, палім знічы. Молімся за іх.



Я і мая сям’я



Твой род, твая Радзіма

Маці, бацька, браты, сёстры. Яны твае самыя родныя, блізкія.

Добра, калі ў цябе ёсць бабуля, дзядуля – гэта з самага малку твае дарагія сямейнікі. Калі ж іх ужо няма, ці ведаеш ты, хто яны былі, як звaліся, ці ёсць у вас дома іх партрэты, іх фатаграфіі?

Ну, а хто былі бацькі тваіх дзядулі і бабулі – твае прадзеды? Як звaліся? Ці захоўваюцца ў вас рэчы, зробленыя іх рукамі, фатаграфіі, лісты?

Ці задумваўся калі ты, адкуль пайшоў твой род, адкуль пачалася твая дарога ў жыццё? Бо твая памяць – гэта памяць твайго роду, а памяць народу – вялікая кніга, якая называецца гісторыя.

Род і народ яднаюцца адным дарагім словам – Радзіма.

Васіль Вітка

1. Як завуць тваіх блізкіх?
2. Хто яны?
3. Чым яны займаюцца?

Радаслоўнае дрэва



Праца нашых бацькоў

Мы – працоўная сям’я:
дзед, бабуля,
тата, мама,
брат з сястрой,
таксама – я.
Тата з даўняе пары
робіць дзіва-трактары.
Мама ў нас – дзіцячы ўрач.
Галава баліць? Не плач!
Калі я хаджу пануры,
мама кажа:
– У жыцці
лекаў лепш за фізкультуру
ад нудоты не знайсці.

Валянцін Лукша



??? **1.** Дзе працуе тата?
2. Кім працуе мама?
3. Дзе працуюць твае бацькі?

4. Запішы адказы на пытанні.

Словы, якія абазначаюць назвы людзей і адказваюць на пытанне *хто*? – гэта **назоўнікі**.



Хто вучыць унучку вязаць?



Хто чытае ўнуку казку?

Прафесіі

Даглядае пчол *пчаляр*,
А майструе стол *сталяр*,
Шыбы ў вокны ставіць *шкляр*,
Сцены беліць нам *маляр*,
Чысціць комін *камінар*,
Сыры варыць *сыравар*.
Ну а цукар – *цукравар*.

З футра выкраіў каўнер
Мне на паліто *кушнер*,
Боты мне пашыў *шавец*,
Новыя штаны – *кравец*.

Цяпер сам разбяры,
А што робяць *муляры*,
дактары, *друкары*?

Васіль Вітка



сталяр



камінар



інфарматык



механік



бібліятэкарка



паліцыянт



бухгалтарка



дантыст



мастак

Нашыя хатнія абавязкі



Кася і Ігар дапамагаюць бацькам. Яны прыбіраюць у кватэры. Ігар чысціць дыван, выцірае пыл з мэблі. Кася паліває кветкі, мые падлогу. Цяпер у кватэры чысціня і парадак.

Прыйшла мама з працы. Яна радая:

– Мае маленькія памочнікі! Якія ж вы працавітыя!

Мама пачаставала дзяцей цукеркамі і яблыкамі.

паводле Паўла Шубы

1. Што робяць Кася і Ігар?
2. Як яны дапамагаюць?
3. Што сказала мама?
4. Чым пачаставала маці дзяцей?

5. Раскажы, як ты дапамагаеш дома.

6. Вывучы верш на памяць.

Хоць маленькая Гануля,
а памочніца матулі.
Купіць тое, што і трэба:
булак, яек, масла, хлеба...
Адпачне яна нямнога,
падмяце тады падлогу,
кветкі ўсе палье, вядома,
пагуляе каля дому...
Зробіць школьныя заданні
без памылак, са стараннем.

Авяр'ян Дзеружынскі

Асабістая гігіена

Раніца



Раз, два, тры, чатыры, пяць –
добра раненька ўставаць.
З самага пачатку
я раблю зарадку.

Чышчу зубы, мыю вушы,
пяць хвілін стаю пад душам -
дождж хвошча па спіне,
дождж слухае мяне.

То ён цёплы, то халодны,
то калючы, то лагодны.
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
добра раненька ўставаць!

Сяргей Грахоўскі



1. Што трэба рабіць, каб прыходзіць у школу чыстымі і акуратнымі?
2. Што трэба рабіць, каб быць здаровым?

3. Запішы сказы ў правільнай паслядоўнасці.

Іду ў школу.
Адпаведна апранаюся.
Спачатку я раблю зарадку.
Я прачынаюся рана.
Старанна мыюся.
Снедаю.
Старанна выціраюся ручніком.
Чышчу зубы.

4. Вывучы вершык-замову на памяць.

Лянота, лянота,
ідзі на балота.
У лесе схавайся,
да нас не чапляйся!

Мой распарадак дня

Карыстаючыся рысункамі,
раскажы, як ты праводзіш дзень.































Працавіты тыдзень

Памагала так умела
Гэля маме ў панядзелак.
А цалюткі дзень аўторак
Правяла ля бабкі хворай.
Як настала серада,
Тата працу ў садзе даў.
Шыла беленькі каўнер
Да сукенкі ў той чацвер.
Віншавалі ў пятніцу
У школе выдатніцу.
Як заўсёды, у суботу
Дома шмат было работы.
А ў святочную нядзелю
Надта ўсе хвалілі Гэлю.

Віктар Швед

1. Раскажы, што Гэля рабіла кожнага дня.

У панядзелак я спяваў.
У аўторак – танцаваў.
У сераду ў басейн хадзіў.
У чацвер я верш вучыў.
У пятніцу ў футбол гуляў.
У суботу маляваў.
У нядзелю парк, буфет,
Клуб, кіно ды інтэрнэт.
Тата з мамаю сцвярджаюць,
Што мяне так развіваюць.

Таццяна Шылько



2. Чым займаўся герой верша ў панядзелак, аўторак, сераду, чацвер, пятніцу, суботу? Запішы адказы ў сшытак.

3. Як ты праводзіш вольны час?

Смачна есці





1. Разгледзь рысункі.



2. Адкажы на пытанні:
У колькі гадзін снедаюць?
Калі абедаюць?
А каторай гадзіне вячэраюць?



3. Запішы сказы:

Я снедаю ў ..... гадзін.
Я ем абед у ..... гадзін.
Я вячэраю а ..... гадзіне.



глыбокая талерка



кубак



лыжка



плыткая талерка



відэлец



нож



сподак

Сядаем за стол



Мы накрываем стол. Спачатку сцелем абрус, а потым ставім посуд. Ставім фаянсавыя талеркі і гліняныя міскі. Злева ад іх кладзем відэлец, а справа нож і лыжку. Яны з металу. Са шкла зробленыя шклянкі і збанкі. Каб было акуратна, спатрэбяцца нам таксама папяровыя сурвэткі. Памыўшы рукі, усе сядаем за стол.

???

1. Што сцелем на стол?
2. Што ставім на стол?
3. З чаго зробленыя талеркі, а з чаго міскі?
4. Што кладзем справа ад талеркі і міскі?
5. Што кладзем злева ад талеркі?
6. Што зроблена з металу?
7. Што зроблена са шкла?
8. З чаго зроблены сурвэткі?
9. Пасля чаго сядаем за стол?
10. Што кажам перад ядою?

Нашае меню

Што ямо на снеданне?



рагалік з маслам



бутэрброд



філіжанка какавы

Што ямо на абед?



бульба (каша, рыс) і катлетка



салата



суп



шклянка кампоту

Выберы, што будзеш есці на падвячорак.



ёгурт



сыр



пячэнне



кубак малака

Што з’ямо на вячэру?



кефір



гарбата



луста хлеба



джэм



вяндліна

Новы дом

Вырас дом на плошчы новы,
Не малы – шматпавярховы.
Вокны сонцам зіхацяць,
Адусюль ён нам відаць.
Добра жыць у доме тым
І дарослым і малым!
Ліфт цябе і ўніз і ўверх –
На любы вязе паверх;
А ў кватэрах – зазірні:
Электрычныя агні,
Радыё, водаправод –
І ніякіх вам турбот!
Маня, Коля, Ясь, Мацей –
Многа ў ім жыве дзяцей!
Мы таксама ў гэтым годзе
Жыць у дом той пераходзім.

Іван Шуцько



1. Які дом пабудавалі на плошчы?
2. Чаму добра жыць у тым доме?
3. Дзе ты жывеш?
4. На якой вуліцы твой дом?
5. Колькі ў ім паверхаў?

6. Назаві імёны дзяцей, якія там жывуць.

Мой пакой


шафа
падушка
кніжная паліца
крэсла
карціна
гадзіннік
лямпа
пісьмовы стол
мячык
мішка
канапа
заплечнік
дыван
ролікі

Наваселле



Сяргейка пераязджае ў новую кватэру. Яна на сёмым паверсе.

У кватэры тры пакоі.

У Сяргейкаў пакой купілі ложак, пісьмовы стол, кніжную шафу. Будзе месца для падручнікаў, кніг. Ёсць тут і шафа для адзення.

Грузчыкі нясуць тэлевізар, дыван, канапу. Тата нясе крэсла, мама – посуд. У руках хлопчыка вазон з кветкамі.

паводле Паўла Шубы

???

1. На якім паверсе новая кватэра?
2. Колькі ў ёй пакояў?
3. Што купілі ў Сяргейкаў пакой?
4. Што нясуць у кватэру грузчыкі?
5. Што нясуць тата, мама, Сяргейка?

Эх ты, зімачка, зіма



Ляцяць сняжынкі

Глядзі, які дзянёк цудоўны:
ляцяць сняжынкі ў цішыні,
прыслухайся – ледзь-ледзь улоўны
ідзе шумочак з вышыні.

Ляцяць сняжыначкі павольна,
зачараваныя зямлёй,
ім гэтак лёгка і прывольна
над лесам, полем, над ракой.

Ляцяць сняжынкі з сівай хмары,
як матылёчкі на святло,
і ўсё пра іх, здаецца, марыць –
і лес, і поле, і сяло.

Васіль Жуковіч

???

1. Які настрой у вершы?
2. Як ляцяць сняжынкі?
3. Як разумееш словы «і ўсё пра іх, здаецца, марыць»?
4. Што табе прыпамінаюць сняжынкі?

???

1. Хто і адкуль да нас прыехаў?
2. Апішы яе выгляд.
3. Што зрабіла Чараўніца з вадой?
4. Што зрабіла Чараўніца з лясамі?
5. Што зрабіла Чараўніца з палямі?

Чараўніца Зіма. Прыметнік



З далёкай поўначы, з краю вечнага снегу і лёду, парай белых касматых мядзведзяў, спавітая ў белыя пуховыя тканіны, прыехала да нас Чараўніца. Зачаравала воды нашай мілай Зямелькі, і зрабіліся яны камянямі празрыстымі. Зачаравала лясы нашы, і заснулі яны сном глыбокім. Патрэсла шырокімі рукавамі сваёй пуховай вопраткі, і пакрыліся палі нашы снежнай беллю. І лёг наш край пад нагамі Чараўніцы – белы, ціхі, задумлівы. Рада яна са свае моцы, усміхнулася смехам ясным, хоць халодным, і ад гэтага ўсмеху заіскрылася ўсё кругом цэлым морам брыльянтаў шматколерных. І стаіць сярод гэтага мора белі і бляску магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная – госця наша штогодняя з далёкай поўначы – Чараўніца Зіма.

Зоська Верас

1. Карыстаючыся тэкстам, падбяры адпаведныя словы:



мядзведзі (якія?) ....., ...
тканіны (якія?) ....., ...
камяні (якія?) .....
сон (які?) .....
рукавы (якія?) .....
вопратка (якая?) .....
край (які?) ....., ..., ...
смех (які?) ....., ...
брыльянты (якія?) .....
зіма (якая?) ....., ..., ..., ...

2. Чаму аўтарка называе нашу госцю «... магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная»?

Словы, якія адказваюць на пытанні *які? якая? якое?якія?* і абазначаюць якасці і прыметы прадметаў і асоб, называюцца **прыметнікамі**.

3. Падбяры назвы колераў да назваў прадметаў:

лісток – ....., ..., ...
яблык – ....., ..., ...
шапка – ....., ..., ...
рукавічкі – ....., ..., ...
стол – ....., ..., ...

4. Падбяры прыметнікі да назоўнікаў:

снег – .....
сонца – .....
лес – .....
крэсла – .....
шалік – .....

Як я пазнаю свет?





чую





бачу





адчуваю пах



дакранаюся

адчуваю смак





1. Дапішы словы паводле ўзору:

чытаў – чытала	бачыў –	мыў – .....
пісаў –	быў –	еў – .....
плаваў –	сеў –	чуў – .....

Дзеяслоў

Мой робат



Я стварыў робата.

Запраграмаваў яго такім чынам, каб дапамагаў мне рабіць усё па раскладзе.

Раніцай робат будзіць мяне. Ён не дазваляе паваляцца ў ложку. Адразу ж кліча на зарадку, потым мыцца, старанна чысціць зубы, снедаць.

Робат ідзе са мной у школу. Ён сочыць за маёй вучобай і паводзінамі на ўроках. Настаўніца задаволеная мной.

Прыходзім са школы. Сядаем за ўрокі. А сонейка заглядае праз акно і кліча пагуляць. Мой робат гэтага не разумее. У яго ж праграма.

Вечарам пасля калыханкі робат вядзе мяне спаць. У гэты час па тэлевізары пачынаецца новы фільм. Але робат ад праграмы не адступае.

Назаўтра я прапанаваў свайго робата сябру. Няхай і ён пажыве па раскладзе.

Паводле Васіля Хомчанкі

??? 1. Ці хочаш стаць уласнікам такога робата? Чаму?
2. У чым дапамагаў робат хлопчыку?
3. Чаго пільнаваў робат?
4. Што хлопец зрабіў са сваім робатам?

Словы, якія абазначаюць дзеянні, называюцца **дзеясловамі**. Яны адказваюць на пытанні *што робіць? што рабіў? што зробіць? што будзе рабіць?*



стаю



спяваю



малюю



плаваю



ем

5. Знайдзі ў апавяданні дзеясловы. Запішы іх у сшытак.

Хто як зіму сустракае



Пад елачкай, пад зялёнай – хатка зайчыка. Змяніўся пад зіму зайчык з выгляду. Шэрая летняя поўсць выпала. Замест яе выросла светлая, пухнатая. Цёпла ў ёй будзе зайчыку зімой, ды і ворагу цяжэй заўважыць яго на снезе.

Лісічка норку падрыхтавала. У норцы з мяккага лісця цёплую пасцель сабе зрабіла.

Жабы закапаліся ў глей і ляжаць нерухома. Крот глыбока залез у зямлю і таксама заснуў. Мядзведзі крывалапыя таксама спяць у сваіх бярлогах.



Толькі бяздомнаму ваўку не да спачынку. Валочыцца ён цэлую ноч у пошуках ежы ды заводзіць на ўвесь лес свае воўчыя песні.

Валянтына Пашкевіч

??? **1.** Як звяры сустракаюць зіму?
2. Хто са звяроў заснуў?

3. Прачытай сказы пра падрыхтоўку зайца да зімы.

4. Запішы ў сшытку дзевяць назоўнікаў, якія абазначаюць назвы людзей або звяроў.

У беларускай мове пра звяроў, як і пра людзей, пытаем *хто?*.

Цецерукі на бярозах



Па дарозе ўздоўж лесу едуць сані. Канём кіруе старэнькі дзядок. Побач з ім сядзіць хлопчык. Раптам ён, зацікаўлены, аж падаецца наперад, ажыўляецца:

– Дзядуля, што гэта за птушкі на бярозах сядзяць?

– Цецерукі, унучак.

– А чаму іх ніхто не паловіць, такіх прыгожых?

– Гэта, унучак, надзвычай асцярожныя птушкі, – тлумачыць дзед. – Нашто ўжо ястраб добры лятун, а і той не можа цецерукоў у палёце дагнаць.

– А што яны робяць на дрэвах?

– Кормяцца.

– Чым?

– Бярозавымі пупышкамі. Калі няма нічога лепшага, то і гэтаму рад будзеш.

– А дзе яны хаваюцца, як ноч прыйдзе?

– У снезе, унучак.

– У снезе?! – здзіўляецца хлопчык, не разумеючы, як можна спаць у снезе.

– Надвячоркам апусцяцца чародкай дзе-небудзь на лясной палянцы, закапаюцца ў пульхны снег дый паснуць.

– І не холадна ім?

– Лепей, чым на голым суку, на марозе. Зацішней як-ніяк.

Хлопчык з цікавасцю ўглядаецца ў цецерукоў на белых бярозах. Што за прыгожыя птушкі! Самі чорныя, бы той вугаль, бровы чырвоныя. На крылах быццам люстэркі срэбныя блішчаць.

Вось яны пачулі гамонку і з шумам сарваліся з бяроз. Вялікія, зграбныя, таропка ляцяць над белым полем. А хлопчык як зачараваны глядзіць ім услед.

Рыгор Ігнаценка

1. Хто герой гэтага апавядання?
2. Дзе адбываюцца ўсе падзеі?
3. Якіх птушак убачылі дзед і ўнук у лесе?
4. Што дзед расказаў хлопцу пра цецерукоў?
5. Чым кормяцца птушкі зімою?
6. Дзе зімуюць цецерукі?

7. Знайдзі ў тэксце па шэсць назоўнікаў, дзеясловаў, прыметнікаў. Прачытай іх.

8. Складзі свае сказы пра выгляд цецерука, карыстаючыся сказамі з тэксту.

Мова складаецца са сказаў.
Сказ выражае закончаную думку.
Сказы складаюцца са слоў.
Словы ў сказе звязаныя сэнсам.

9. З наступных слоў складзі і запішы сказы:

экскурсію, у, мы, на, паехалі, лес
лесе, у, прыгожа, зімою
выглядаюць, з
снегам, дрэвы, казкі, як, засыпаныя,

Ляціце, птушкі, да нашай...



Адгадайце, што за хатку
Змайстравалі мы з Ігнаткам:
Дах, падлога, скарб усякі,
Толькі сцен няма ніякіх,
І, вядома, ад таго
І акна ні аднаго…
А стаіць яна ў садку,
На бярозавым суку:
Тут і хлеб, тут і зярнятка...
Ну дык што гэта за хатка?

Іван Шуцько

1. Закончы сказ:

Хатка, якую змайстравалі хлопцы, – гэта ..... .

2. Прачытай уважліва.





Дрэнна птушкам зімою. Зямля пакрытая снегам, нават на дрэвах снег.

На дварэ холадна. Трашчаць маразы.

Птушкі, якія зімуюць у нас, набліжаюцца да чалавечага жылля. Тут яны хутчэй знойдуць сабе ежу.

Скачуць па снезе вераб'і, падбіраюць крошкі. Галкі і вароны цэлымі чародамі кружацца каля двароў, шукаюць пажывы.

Нават асцярожныя сарокі наведваюць гарады і вёскі. Каля людзей спадзяюцца яны чым-небудзь пажывіцца.

Да кармушак ахвотна ляцяць сінічкі і снегіры.

3. Якія птушкі зімуюць у нас?
4. Як можам дапамагаць птушкам зімою?

Мяцеліца



– Ну і мяцеліца круціць, свету белага не відаць! – усклікнуў бацька, абтрасаючы снег з каўняра, шапкі, валёнак.

– Татка! А як мяцеліца круціць? – ускочыў з пасцелі Лёнька. – Якая яна?

Бацька распрануўся. Падышоў да ложка:

– Хочаш ведаць, як круціць мяцеліца і як яна выглядае?

– Хачу, – адказвае Лёнька. – Раскажы.

– Добра, раскажу, – абяцае бацька, – толькі хутчэй лезь назад пад коўдру.

...Далёка-далёка на поўначы жыве вецер. Вялікі працаўнік і весялун. Многа ў яго спраў. Трэба і хмары прагнаць, і мора ўсхваляваць, і птушанят пакалыхаць на галінцы.

Стоміцца вецер за дзень. І хочацца яму адпачыць, пацешыцца. Тады ідзе ён на стайню. Выводзіць і запрагае ў лёгкія санкі трыста белых летуноў-коней. І гайда! Па палях, па лугах, па вуліцах!

Дзівяцца людзі: «Вось мяцеліца разгулялася!»

І не бачаць, дзівакі, як ляцяць белыя коні, як сцелюцца доўгія грывы і хвасты, не чуюць, як звіняць падковы. Людзі шмат чаго не чуюць і не бачаць...

А вецер! Прыгажун вецер! Левай рукой кіруе, а правай шапку прытрымлівае. Імкліва імчацца коні. Але ветру яшчэ хутчэй хочацца. Як свісне ды гікне вецер:

– Гэй вы! Грывастыя!

І коні віхрам імчаць далей і далей.

Падляцелі да дрымучага лесу. Не спыніліся, паімчалі па заснежаных вяршынях елак і соснаў. Стогне ўстрывожаны бор. Векавы дуб прачнуўся, незадаволена бурчыць:

– Вось каб злавіць...

Але паспрабуй злавіць вецер, злавіць мяцеліцу. Іх і след прастыў... Памчаліся далей, далей...

– Далей... далей... – шэпча Лёнька і засынае. І ўсміхаецца скрозь сон. Пальчыкамі перабірае. Напэўна, вецер лейцы яму перадаў. І Лёнька сам кіруе мяцеліцай.

Мікола Янчанка

1. Ці спадабалася табе гэтае апавяданне?
2. Як завуць яго героя?
3. Як аўтар апісвае мяцеліцу?

4. Знайдзі ў тэксце апісанне ветру. Прачытай уголас.

5. Запішы адказы на пытанні:

Дзе жыве вецер?
Які ён?
Чым ён займаецца?

Сказы, у якіх пра нешта расказваем, паведамляем,
– гэта сказы **апавядальныя.**
Сказы, у якіх пра нешта пытаем,
– гэта сказы **пытальныя**.
Сказы, якія пабуджаюць да дзеяння (просьба, загад, пажаданне),
– гэта сказы **клічныя**.

6. Знайдзі ў апавяданні прыклады такіх сказаў. Прачытай іх з адпаведнай інтанацыяй.

7. Паспрабуй намаляваць апісаную мяцеліцу.

Зімовыя Святы

Год ахвочы да прыгод



Год
Ахвочы да прыгод,
Круціць, кружыць карагод.
Пачынае пералік:
Студзень,
Люты,
Сакавік.
Студзень студзіць
Рунь густую.
Люты злосны,
Ён лютуе.
Сок пускае сакавік –
Да салодкага прывык.
Следам з краскай
Красавік,
І лясун і палявік.
Травень-май
Траву лагодзіць.
Чэрвень
З чырванню прыходзіць.
Ліпень
Ліпам цвет прыносіць.
Жнівень жне,
Атаву косіць.
Раіць
Верасень вясёлы:
Хай лятуць на ўзлесак
Пчолы.
Там не зябнуць
Ад расы,
Зацвітаюць верасы.
І кастрычнік не гуляе –





Клопату з ільном хапае.
Разлятаюцца кастрынкі,
Як халодныя іскрынкі.
Лістапад
Надвор'ем мглістым
Высцілае сцежкі
Лістам.
Снежань-лежань
Снег трасе.
Вось вам месяцы
І ўсе.
І нанова
Кожны год
Пачынае карагод.

Рыгор Барадулін



1. Раскажы, чым займаецца кожны з месяцаў.
2. Растлумач, адкуль пайшлі назвы месяцаў.

3. Новы год прыносіць нам новыя планы, мары, рашэнні. Гэта час на тое, каб падумаць, што можам памяняць у сваім жыцці на лепшае. Падумай і адкажы, якія твае навагоднія рашэнні.

4. Павіншуй з Новым годам сваіх блізкіх. Можаш пакарыстацца прапанаванымі ніжэй словамі і словазлучэннямі.

♥ шчасця
♥ поспехаў у навуцы (працы)
♥ здароўя
♥ верных (надзейных) сяброў
♥ радасці
♥ сонечных дзён



Дванаццаць птушак



Ляціць дванаццаць птушак. Лятуць першыя тры: на дварэ завеі, маразы, вятры. Паляцелі тры наступныя: снег знікае, усё ажывае. Узнялася трэцяя тройка: зрабілася горача, спякотна. А як пачалі ляцець чацвёртыя тры – паплылі хмары, пайшлі дажджы, узняліся вятры.

А птушкі тыя не простыя: у кожнай па чатыры крылы, а ў кожным крыле па сем пёраў.

Кожнае пяро сваё імя мае і напалавіну белым, напалавіну чорным бывае.

Махне птушка крылом – зробіцца светла-светла, махне другім – цёмна-цёмна.

Валянтына Пашкевіч

1. Назаві па чарзе ўсе птушкі.

2. Чаму яны ляцелі па тры?
3. Чаму ў кожнай па чатыры крылы?
4. Якія пёры ў кожным крыле? Назаві іх.

5. Дапішы сказы:

Зімовыя месяцы – гэта: ....., ..., ...
Вясновыя месяцы – гэта: ....., ..., ...
Летнія месяцы – гэта: ....., ..., ...
Восеньскія месяцы – гэта: ....., ..., ...

Каляды



Каляды – свята нараджэння Ісуса Хрыста, які з’явіўся на свет, каб збавіць людзей ад грахоў, навучыць іх дабру, згодзе і міласэрнасці. Гэта вельмі старадаўняе і надзвычай цікавае народнае свята.

Кажуць, што слова «каляды» запазычанае, бо нагадвае лацінскае «календы» – так старажытныя рымляне называлі першы дзень кожнага месяца. Разам з тым ёсць меркаванне, што слова «каляды» ўтварылася ад слова «кола». Год сапраўды падобны да дзівоснага кола: на змену зіме прыходзіць вясна, за вясною прамільгае лета, потым наступае восень, а за восенню – зноў зіма.

Увечары перад Калядамі сям’я збіралася на першую куццю. Куццёй называлі кашу, звараную з ячных круп. Часам яе падсалоджвалі мёдам. На першую куццю дазвалялася есці ўсё, акрамя каўбас і мяса. У заможных сем’ях гатавалася ажно дванаццаць страў, і ўсе трэба было абавязкова пакаштаваць. Каб шчасціла ў хаце, гаспадыня пасыпала стол жытам і, памятаючы, што Ісус Хрыстос нарадзіўся ў яслях, церусіла па жыце сена, засцілала зверху бялюткі абрус. Гаспадар сядаў на покуць, па абедзве рукі ад яго – жонка і дзеці. Пасля малітвы ён зачэрпваў першую лыжку куцці. Куццю і астатнія стравы не з’ядалі да канца, а пакідалі пакаштаваць нябожчыкам-дзядам, душы якіх прыходзілі ў хату на святую вячэру.

Уладзімір Ягоўдзік



Нарадзіўся Божы Сын

Промень зоркі
З неба ліўся
ў цішыню начных далін.
Нарадзіўся,
нарадзіўся,
нарадзіўся
Божы Сын!

Ён узяў
сабе на плечы
незвычайны, дзіўны лёс.
У абліччы чалавечым
Божы Сын –
Ісус Хрыстос.

Зорка з неба
ярка свеціць,
сее ззянне па зямлі,
каб дарослыя
і дзеці
да Хрыста
свой шлях знайшлі.

Промень зоркі
запаліўся
самай радаснай з навін:
– Нарадзіўся,
нарадзіўся,
нарадзіўся
Божы Сын!

Артур Вольскі

??? 1. Адкуль паходзіць слова «каляды»?
2. Якія калядныя абрады і традыцыі апісаныя ў тэксце? Прачытай адпаведныя сказы.
3. Як адзначаюць Каляды ў тваёй сям'і?

??? 1. Які настрой у вершы?

!!! 2. Вывучы верш на памяць.

Коледа!

Чый то сыночок
садыв садочок,
Коледа!
Садыв садочок,
всё з вышэнёчок,
Коледа!
Олі сыночок
садыв садочок,
Коледа!
А в туом садочку
всё хорошое,
Коледа!
Вышні, чэрэшні,
грушкі, яблушкі,
Коледа!
Грушкі, яблушкі
час обтрэсаты,
Коледа!
Молодого Ваню
час в школу даты,
Коледа!
З школы узявшы
до вуойська даты,
Коледа!
З вуойська узявшы
помужоваты,
Коледа!



Калядка, якую спявалі ў хаце з нованароджаным дзіцем.
Вёска Градалі.

???

1. Ці разумееш усе словы з гэтай калядкі?
2. Чаму гэтую калядку спявалі бацькам нованароджанага дзіцяці?
3. Ці ты бачыў (бачыла) калядніка?
4. Што носяць з сабой калядніка?

Васілёва маці пошла гоготаці



Васілёва маці
Пошла гоготаці,
Старых ліет спомінаці.
Роді Божэ жыто
На новое ліето!
Корч корчысты,
Стэб стэбэлісты,
Колос з колосочка,
Будэ жыта бочка.
Стэлісь стэбэліця!
Будэ мыска пшэніці,
В діежці зыхуодно,
В клуні молуотно,
А в хаті рожа,
Господыня гожа.
Гу-гу-гу!
Дайтэ кішку як дугу!

Гэта навагоднія віншаванні з вёскі Арэшкава.

??? **1.** Калі праваслаўныя святкуюць Новы год? Ці ведаеш чаму?

2. Папытай у сваіх бабулі і дзядулі:

Якія стравы елі людзі
ў навагоднюю ноч?
Як маладыя людзі паводзілі сябе
ўвечары напярэдадні Новага года?
Чым яны займаліся?
Што абазначае слова «гоготаці»?

3. Запішы пару сказаў на гэтую тэму.

Бабулі



– Бабкі лепшае няма,
Як мая, у цэлым свеце.
Не крычыць яна дарма,
Ласкаю прывеціць.
Звяжа цёплыя пальчаткі
Мне на Новы год,
А калі спячэ аладкі –
Скачуць проста ў рот!

– А мая бабуля казкі
Любіць
Баіць-гаварыць,
Цэлы вечар будзеш слухаць,
сон не здолее змарыць:
То ў дрымучы бор
Заглянеш,
Дзе жыве
Стары мядзведзь,
То ваўчыху напаткаеш –
Уцячэш ледзь-ледзь...
Безліч казак бабка знае,
Іх заўжды ахвотна бае.

І таму
Шануюць дзеці
Сваіх бабак нездарма,
Бо для іх
Нікога ў свеце
Ласкавейшага няма.

Авяр'ян Дзеружынскі

??? **1.** Чаму любіш сваю бабулю?
2. Раскажы пра яе.

3. Закончы сказ:

Мая бабуля .....
.....

Гузік



Прыйшла Надзя са школы і сказала:

– Бабуля, у мяне гузік адарваўся. Прышый.

– Нясі, унучачка, іголку з ніткамі.

Прынесла Надзя іголку і ніткі, падала бабулі.

– Вочы мае дрэнна бачаць, – сказала бабуля. – Зацягні нітку ў іголку.

Надзя зацягнула.

– А цяпер вазьмі гузік, прыкладзі яго да паліто, вось сюды. Укалі іголку ў дзірачку. Так, правільна. Цяпер у другую.

Надзя рабіла так, як гаварыла бабуля, і не заўважыла, як прышыла гузік. Потым ужо сама аглядзела ўсе гузікі на сваім паліто і сукенках, дзе слаба трымаліся, падмацавала.

– Можа, і табе, бабуля, трэба дзе гузік прышыць?

Знайшоўся такі гузік на ватоўцы – матляўся на адной нітцы. Надзя адарвала яго зусім і прышыла нанава.

– Дзякуй табе, бабуля, – з усмешкай сказала Надзя.

– За што дзякуй? Ты ж сама ўсё зрабіла.

– А за навуку.

Васіль Хомчанка

???

1. За што ўнучка дзякавала сваёй бабулі?
2. Як бабуля навучыла Надзю прышываць гузікі?
3. Як ты праводзіш час са сваёй бабуляй?
4. Што вы супольна робіце?
5. Ці ты ўмееш прышыць гузік?

Зімовыя гульні



Лыжы

I

У маленькім завулку вялікага горада стаяў чырвоны цагляны домік. У ім жылі па суседстве дзяўчынка Ніна і хлопчык Сеня.

Аднаго разу Ніна і Сеня сядзелі каля акна і пазіралі на двор. За акном пушынкамі падаў снег. Белы дыван заслаў увесь завулак. Плот і веснічкі надзелі мяккія пушыстыя шапкі. А снежныя матылькі ўсё кружыліся і кружыліся...

– Эх, як добра было б пакатацца! – уздыхнула Ніна.

Але як гэта зрабіць? У яе ёсць лыжы, але на іх парваліся раменьчыкі, ды і палак няма.

– Ведаеш што, Ніна, я адрамантую твае лыжы, а ў мяне ёсць палкі, будзем катацца. Добра? – прапанаваў Сеня.

– Добра, – адказала дзяўчынка.

Так у Ніны і Сені з'явіліся лыжы. Дзеці хадзілі ў школу ў розныя змены, дык Сеня катаўся зранку, а Ніна – пасля абеду.

II

Усё ішло добра. Але вось насталі зімовыя канікулы. Аднойчы ім захацелася абаім пакатацца зранку. А лыжы адны. Заспрачаліся, і ніхто з іх не захацеў саступіць.

Дзяўчынка казала, што лыжы яе, а Сеня даводзіў сваё:

– А хто іх адрамантаваў? А палкі чые?

Раззлаваўшыся, яны пачалі вырываць адно ў аднаго лыжы. Пасля хлопчык адарваў раменьчыкі, забраў свае палкі і пайшоў дадому.

III

Стаяць у калідоры ў адным кутку лыжы з адарванымі раменьчыкамі, а ў другім – палкі.

Прыйшлі з работы іхнія мамы, паглядзелі на сваіх дзяцей і зразумелі, за што не паладзілі дзеці. Узялі палкі і закінулі на гарышча.

Сядзяць хлопчык і дзяўчынка дома і глядзяць праз акно на двор. А снег вялікімі пушынкамі ўсё ляціць, усё падае.

Сеня моўчкі ўстаў і палез на гарышча. Дастаў лыжы, схаваўся ў дрывотні і пачаў зноў прыладкоўваць раменьчыкі. Зрабіў як след, памазаў іх, каб добра слізгацелі.

«Пайду скажу Ніне, што зноў лыжы спраўныя. Няхай ідзе першая пакатацца», – падумаў хлопчык.

IV

Але дзяўчынкі дома не было. Тады Сеня пайшоў да яе сяброўкі і, не знайшоўшы там Ніны, вярнуўся дахаты, каб узяць лыжы ды пакатацца самому.

Глянуў, а лыжаў няма. Не разумеючы, куды дзеліся лыжы, ён, засмучаны, паплёўся на горку. І раптам бачыць, што на горку ўзбіраецца Ніна на лыжах.

– Ну, я табе пакажу! – гукнуў раззлаваны Сеня.

Але дзяўчынка была высока на горцы і не пачула пагрозы. Яна лёгка адштурхнулася і віхрам зляцела ўніз.

У хлопчыка аж дух заняло.

– Вось гэта здорава! – падумаў Сеня.

Тут Ніна крута развярнулася і памчалася па снежным полі. Сеня нават забыўся на сваю пагрозу і, калі дзяўчынка параўнялася з ім і хацела аддаць лыжы, сказаў:

– Не трэба. Катайся, а я пасля...

Ніна ўсміхнулася і пачала ўзбірацца на горку.

Клаўдзія Каліна

1. Як у Ніны і Сені з’явіліся лыжы?
2. Праз што ўзнікла спрэчка?
3. Як закончылася сварка?
4. Што вырашыў зрабіць Сеня?
5. Дзе хлопец сустрэў сяброўку?
6. Што зрабіў Сеня, сустрэўшы Ніну?
7. Чаму Сеня не забраў лыжаў?

8. Прыдумай загалоўкі да кожнай часткі апавядання.

На санках



Які сягоння
коўзкі снег!
Як лёгка
з ветрам дужацца!
Нішто не спыніць
санак бег,
хоць і галовы кружацца...

Няхай сняжынкі ў вочы б’юць
і маразы
сярдуюцца! –
А санкі полазам пяюць,
і холаду –
не чуецца...



Імчым з гары,
ляцім з гары.
З дарогі, гурбы снежныя!
Уся зямля
для дзетвары –
У гэты дзень – бязмежная!..

Кастусь Кірэенка

???

1. Які настрой у гэтым вершы?
2. Як дзеці катаюцца з гары?
3. Як яшчэ можна бавіць час зімою?

4. Прачытай радкі, дзе гаворыцца, як дзеці катаюцца з гары.

5. Запішы некалькі сказаў пра свае зімовыя гульні.

Словы для выкарыстання: катацца, коўзанка, канькі, санкі, лыжы, з горкі, снегавік, снежныя шары, ляпіць, гуляць у снежкі, будаваць, коўзацца.

Лепім снегавіка

Галка

У агародчыку зляпіў я Дзеда Мароза са снегу. Дзе вочы – чорныя вугольчыкі ўторкнуў. А нос зрабіў з вялікай жоўтай морквы.

У рукі Дзеду Марозу даў скрыначку і насыпаў туды зярнят.

– Частуй птушак, – сказаў я яму, а сам зайшоў у хату і стаў каля акна.

Прыляцела першая сінічка. Піскнула, села на край скрыначкі, дзеўбанула раз, другі. Потым снягір апусціўся побач. А нахабны верабей залез у кармушку з нагамі.

Чорная галка з бярозы таксама заўважыла кармушку. Пераляцела на самую ніжнюю галінку, але спусціцца на кармушку не адважылася.

Пакуль так галка сядзела ды аглядвалася, птушкі ўсё падзяўблі і разляцеліся.

Галка скокнула ў кармушку, а ў кармушцы – пуста.

Яна са злосці схапіла дзюбай моркву і паляцела з ёю.

І Дзед Мароз застаўся без носа.

Васіль Хомчанка







??? 1. Як выглядаў снегавы Дзед Мароз?
2. Якія птушкі прыляцелі да кармушкі?
3. Што зрабіла галка?

4. Апішы снегавіка. Не забудзь напісаць пра наступнае:

– хто і дзе яго зляпіў,
– з чаго ён зроблены,
– яго будова (галава, вочы, нос, вусны, рукі, тулава),
– якой ён велічыні,
– што ў яго на галаве,
– ці мае нешта ў руках,
– што думаеш пра яго.

Род назоўніка





1. Прачытай пачатак верша Артура Вольскага.

Той,
хто быць пісьменным хоча,
знаць павінен з першых год
род мужчынскі,
род жаночы
і яшчэ –
ніякі род.

2. Якія роды называе паэт у сваім вершы?

Назоўнікі, якія можна замяніць словамі **ён**, **мой**, адносяцца да **мужчынскага роду**: *пенал, вечар, конь, сабака, сталяр, бацька*.

Назоўнікі, якія можна замяніць словамі **яна**, **мая**, адносяцца да **жаночага роду**: *мама, школа, зямля, зіма, мяцеліца, мышка*.

Назоўнікі, якія можна замяніць словамі **яно**, **маё**, адносяцца да **ніякага роду**: *возера, кацяня, поле, сонца, гняздо, пяро*.

3. Вызначы род назоўнікаў.

герой, каляндар, настаўніца, суп, святло, песня, помнік, дрэва, рака, дзяўчынка, тыгр, папера, снегавік, ноч, шчасце.

4. Прачытай дыялог.

– Смех – гэта дзеяслоў, таму што гэта назва дзеяння, – сказаў Алесь.

– Ды не, – запярэчыла Зося. – Смех – гэта назва прадмета. Значыць слова «смех» – назоўнік.

– Ці ж смех – гэта прадмет? – не стрымаўся Валодзя. – Паспрабуй, Зося, дакрануцца да яго рукамі.

– Ды не спрачайцеся вы! Смех – гэта дзеяслоў, калі я смяюся. А калі я чую чый-небудзь смех – гэта прадмет, – разважыў Пятрок.

5. Да якой часціны мовы адносіцца слова *смех*?
6. Да якой часціны мовы адносіцца слова *смяяцца*?
7. Да якой часціны мовы адносіцца слова *смешны*?

8. Запішы сказы са словамі *смех, смяяцца, смешны*.

Словы на снезе



Зіма лютуе ўсё мацней. Насыпае больш глыбокія снежныя сумёты.

На дарогах гурбы.

Яры і канавы замяло да краёў. У барах і гаях пад цяжарам снегу згінаюцца і нават ломяцца маладыя хвойкі і бярозкі.

Калі заціхне мяцеліца і засвеціць скупое зімовае сонца, на свежым снезе відаць розныя сляды. Яны, як словы ў цікавай кнізе, расказваюць пра клопаты і прыгоды звяроў і птушак. Апавядаюць пра іх цяжкае жыццё ў самую суровую пару года.

Ні ў лесе, ні ў полі не знойдзеш ніякага корму. Рыба ў азёрах задыхаецца пад тоўстым панцырам з лёду і снегу.

Міхась – сябар прыроды.

У вольны час ён становіцца на лыжы і вязе да хмызняку на краі поля ахапак канюшыны ці духмянага сена. Там кладзе яго ў куст на такой вышыні, каб заяц, падняўшыся на заднія лапы, мог дастаць.

Міхась знарок выбірае куст не вельмі шырокі і замацоўвае ахапак так, каб заяц не вырваў яго ўвесь адразу і не расцярушыў сена па снезе.

Шэры і сам сабе можа пашкодзіць, бо, вядома ж, у зайца і розум заечы.

Тут жа побач Міхась кладзе прыхопленую з сабой моркву ці бурачок, каб і на дэсерт шэраму было чым паласавацца.

Во колькі ён ноччу напятляў тут слядоў, а цяпер спіць дзенебудзь пад кустом!

І Міхась запрашае:

– Калі ласка, сусед, на сняданак!

Пра сняданак ён, вядома, жартуе, бо добра ведае, што даўгавухі прыйдзе на папаску толькі пасля захаду сонца.

Юлій Ванаг

1. Хто герой гэтага апавядання?
2. Чым ён займаецца?
3. Як Міхась дапамагае звярам?
4. Пра што расказваюць сляды на снезе?





5. Разгледзь малюнкі і запішы іх назвы.















Назоўнікі змяняюцца па ліках. Яны могуць называць адзін прадмет і мець форму **адзіночнага ліку** (*кніга, поле, стол*) або некалькі прадметаў і мець форму **множнага ліку** (*кнігі, палі, сталы*).

6. Прачытай назоўнікі. Змяні іх так, каб яны абазначалі многа прадметаў.

аловак, яблык, зубр, дзень, вока, нос, нага, дарога, дрэва, горад, лес

Люты



Ідзе па зямлі Люты і пытае ў кожнага, ці адзеты, ці абуты. Зайшоў у сяло, пастукаўся да дзеда з бабай.

– Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць, усіх у хату загнаць. Люты я! Пытаю, ці ўсе адзеты, ці ўсе абуты?

– Усе, усе! – адказвае дзед. – У мяне кажух ёсць і валёнкі.

У маёй бабы таксама кажух, і валёнкі, і цёплая хустка. І авечкі, і каровы ў цёплых хлявах. Хата прызбаю абнесена, дроў назапашана... Ідзі лютуй!

Супакоіўся Люты і пайшоў у лес да лясных птушак ды звяроў.

– О-го-го-го! – крычыць на ўвесь лес, аж рэха стогне. – Я Лю-у-у-уты! Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць!

– А ў мяне цёплае дупло! Я накрыюся хвастом і буду спаць! Лютуй! – адказала вавёрачка.

– А я ў берлагу лапу смакчу... – сапе праз сон мядзведзь. – Лютуй сабе!

– А я ў нару схаваюся! – матнуў рудым хвастом ліс.

– Я ямачку ў снезе зраблю! – сказаў заяц. – Я цяпер беленькі, і ніхто мяне не прыкмеціць.

– А мне не страшны ні мароз, ні завея, я ў цёплай камізэльцы! – ціўкнуў снягір.

– Я падамся да ч-ч-чалавечага прытулку-у! – застракатала сарока.

І ўсе звяры і птушкі пахаваліся. Хто ў нару, хто ў дупло, хто пад снег.

І што тут пачалося! Люты як дзьмухне – сумёты як горы выраслі. У маленькіх ялінак і сасонак толькі чубы з-пад снегу тырчаць.

На рэчцы страляе лёд. А Люты лютуе. То марозам сцісне, то завеяй у вочы сыпне. Доўга лютаваў. Нарэшце стаміўся, лёг пад сасною адпачываць і заснуў. Спіць сабе Люты і не чуе бяды.

А сонейка выглянула з-за хмары, нагрэла на сасне снег... І пачало з ледзяшоў капаць: кап! кап!

Выглянула з дупла вавёрка і зацокала на ўвесь лес:

– Спіць Люты! Спіць, не чуе, што Вясна яму рыхтуе!

Вылецеў з дупла дзяцел і як застукае дзюбай, тэлеграму адбівае: – Спіць Люты! Спіць пад сасною, а Са-ка-вік ужо за спіною!

А з ледзяшоў: кап! кап! кап!

Раптам – кап! – проста Лютаму на нос. Падхапіўся Люты, дзьмухнуў раз, другі завеяй, але сілы ўжо няма.

Чуе, Сакавік ужо недалёка.

Клаўдзія Каліна

1. Якія сказы апісваюць вобраз Лютага?
2. Якім чынам людзі і звяры рыхтаваліся да сустрэчы з Лютым?
3. Хто наблізіў прыход Сакавіка?
4. Чаму другі месяц года называюць лютым?



5. Знайдзі ў тэксце «Люты» дзесяць дзеясловаў. Прачытай іх.



6. Выпішы з тэксту «Люты» па тры дзеясловы кожнага часу.

Дзеясловы мяняюцца па часах.

Дзеясловы **цяперашняга часу** адказваюць на пытанні **што робіць? што робяць?**: *спіць, грэе, лютуе, мерзнуць.*

Дзеясловы **прошлага часу** адказваюць на пытанні **што рабіў? што зрабіў? што рабілі? што зрабілі?**: *спаў, грэла, лютавала, змерзлі.*

Дзеясловы **будучага часу** адказваюць на пытанні **што зробіць? што будзе рабіць? што зробяць? што будуць рабіць?**: *засне, будзе грэць, будуць лютаваць, змерзнуць.*

Хто самы дужы



Заспрачаліся аднаго разу Мароз, Сонца і Вецер, хто з іх самы дужы. Пайшлі яны ў поле, дзе селянін жыта сеяў.

– Скажы, чалавеча, хто з нас самы дужы? – пытаюць.

Падумаў селянін і кажа:

– Па-мойму, Вецер з вас самы дужы.

– Чаму? – злосна затрашчаў Мароз. – Хіба ты можаш жыта пасеяць, калі я зямлю замарожу?

– Нічога ты адзін без Ветру не зробіш, – адказвае чалавек. – Ты толькі тады моцны, калі табе Вецер памагае.

– Не, усё ж самае дужае з іх я! – засмяялася Сонца. – Толькі я магу Мароз прагнаць і зямлю ўгрэць, каб ты, чалавек, жыта сваё пасеяў.

– Эге, – зноў не згаджаецца селянін. – Ты, Сонейка, толькі тады свеціш, калі Вецер хмары разгоніць.

Пачуў усё гэта Вецер і заганарыўся дужа. Пачаў свістаць ды выхваляцца сваёю сілаю перад сябрамі.

Пайшлі яны гэтак далей. Ажно бачаць, едзе ў возе якісь чалавек.

– Давайце, – кажа Сонца, – праверым нашу сілу на гэтым чалавеку. Хто з нас здзярэ з яго плячэй сярмягу, той і будзе самы дужы.

Тут Вецер і пачаў дзьмуць на чалавека. То з аднаго боку закруціць, то з другога наляціць, свішча, вые, галосіць, сярмягу шкуматае. А чалавек каўнер наставіў, папружку мацней падціснуў дый паганяе сабе каня пужкаю.

Змогся Вецер, з сілы выбіўся, а чалавека так і не распрануў.

– Я, – прызнаўся Мароз, – таксама не здыму з чалавека вопраткі.

А Сонейка ўсміхнулася, вызірнула з-за хмары і давай грэць чалавека на возе.

– Ого, як цёпла стала, – здзівіўся фурман, выціраючы пот з ілба.

– Трэба, мусіць, распранацца.

Супыніў ён свайго каня, расперазаў папружку дый зняў з сябе сярмягу.

– А што, бачыце?? – засмяялася Сонца. – Ласка за любую сілу дужэйшая.

Апрацоўка Хрысціны Лялько

1. Пра што заспрачаліся героі казкі?
2. Што адказаў ім селянін?
3. Як правяралі сваю сілу героі казкі? Прачытай сказы пра гэта.
4. Хто перамог у спрэчцы? Чаму?
5. Якая галоўная думка гэтай казкі?

6. Прачытай. Дапішы да назоўнікаў дзеясловы – назвы адпаведных дзеянняў.

Вецер (што робіць?) .....
Мароз (што рабіў) .....
Сонца (што зрабіла?) .....
Мароз, Сонца і Вецер (што рабілі?) .....
Селянін (што зрабіў?) .....
Чалавек (што робіць?) .....
Фурман (што зрабіў?) .....
Вецер (што зробіць?) .....

Нашыя вопратка і абутак

Раскажы, хто як апранаецца.



шапка

капялюш



паліто





куртка

гальштук

касцюм



кашуля



блуза



майка

камізэлька

нагавіцы



красоўкі

чаравікі



кеды



кепка

футра



стужка



берэт

сукенка



світар

хустка

тапкі

шкарпэткі

сумка





панчохі

спадніца

плашч

туфлі





пантофлі

сандалі

Нашае мінулае



Гісторыя

Тое, што было ўчора, – гэта ўжо гісторыя. Пражыты дзень запісваецца ў нашу біяграфію, у летапіс вашай сям'і, вёскі, горада, усяго свету.

Вучоныя даказалі, што дзясяткі тысяч гадоў назад на тэрыторыі сучаснай нашай краіны жылі людзі. Адрэзак часу ад іх да нас – гэта наша гісторыя. Уяўляеце, колькі ўсяго цікавага адбылося за гэтыя стагоддзі. Людзі развіваліся, вучыліся здабываць і вырошчваць ежу, будаваць жыллё, вырабляць адзенне, посуд, мэблю, зброю. Яны адшліфоўвалі мову, гаворку, склалі азбуку і пачалі бытапісанне.

Гістарычныя веды патрэбны ўсім нам, бо як жа пачнём далей будаваць наш агульны дом, калі не будзем ведаць, на якім падмурку ён стаіць. Як жа знойдзем дарогу ўперад, калі не будзем ведаць, якімі шляхамі ішлі людзі раней за нас. У якім кірунку будзем развіваць свае здольнасці і таленты, калі не даведаемся, што зроблена да нас ва ўсе пражытыя вякі.

Гісторыя нашага народу складваецца з гісторыі нашай мовы, з біяграфій слынных людзей, з памятных падзей, з гісторыі гарадоў, мястэчак, вёсак, з культуры і мудрасці тых пакаленняў, якія жылі да нас.

Уладзімір Ліпскі

???

1. Што такое гісторыя?
2. Чаму неабходна ведаць сваю гісторыю?
3. Як разумееш словазлучэнні: «вось дык гісторыя», «пра гэту гісторыю маўчы», «трапіць у гісторыю», «гістарычная праўда»?

Адкуль Тыневічы



А было так. З нарваўскага праваслаўнага манастыра шляхам на Бельск і Драгічын выбралася трое манахаў. Спыніліся на ўзгорку сярод лесу, расклалі агонь. Потым ужо пастаянна спыняліся на тым самым месцы. Пасля нейкага часу гэтыя манахі пабудавалі тут сабе тын – загарадзь з тоўстых бярвёнаў, каб абараняла іх ад драпежных звяроў. Памалу тын разрастаўся, побач з ім пасяліліся мужыкі, людзі пачалі карчаваць лес і займацца земляробствам. У Нарве жыхароў недалёкага тына пачалі называць тыневічамі. Так ужо і засталося да сённяшняга дня. Ад назвы жыхароў пачала называцца цэлая вёска.

Цяпер ёсць дзве вёскі Тыневічы: Вялікія і Малыя.

З кнігі «Белая Русь. Гісторыя Беларусі ў легендах і паданнях»

???

1. Ад чаго пайшла назва вёскі Тыневічы?
2. У якой гміне Тыневічы?
3. У якім павеце Тыневічы?
4. Ці ведаеш адкуль назва мясцовасці, у якой ты жывеш?

5. Знайдзі на карце Падляшскага ваяводства мясцовасці з легенды.

6. Падрыхтуй расказ пра ўзнікненне назвы якой-небудзь мясцовасці з Падляшша.

Горка ля Новага Беразова



Недалёка ад вёскі Новае Беразова знаходзіцца невялічкая горка, на якой зараз расце малады густы лес. Навокал гэтай горкі ляжаць пясчаныя палі гаспадароў. Дзялянкі некаторых гаспадароў праходзяць праз гэтую горку, і гаспадары незадаволеныя, што не могуць пасеяць там ні грэчкі, ні жыта.

Раней, як гавораць, за памяці іх дзядоў, горкі не было. На гэтым месцы стаяла вельмі прыгожая і багатая царква. Прыходзілі сюды людзі з суседніх, а нават з далёкіх вёсак. Яна не была звычайнай. У гэтай царкве часам бывалі цуды, і таму, калі прыйдзе вялікае свята, то збярэцца столькі народу, што поўная царква, а нават вакол царквы. А святары выходзяць благаслаўляць народ.

Аднойчы было так. Адзін чалавек вельмі доўга хварэў і быў ужо пры смерці. Людзі яго прывезлі да царквы, дзе святары яго аздаравілі.

Так ішла слава пра цуд-царкву. Людзі прыносілі сюды багатыя дары і складалі іх на царкву. Не падабалася гэта пэўным злодзеям, якія рашылі дабрацца да царквы і забраць усё багацце.

Аднойчы на вялікім свяце, калі людзі прынеслі да царквы многа дароў, злодзеі рашылі абакрасці царкву менавіта ў тую ноч. Было іх трое. Яны былі вядомыя на ўсю аколіцу. Ноччу ўзялі жалезны лом, каб аглушыць стоража, і пайшлі. Ціхенька падкраліся да царквы, аглушылі стоража, узялі ключы і ўвайшлі ўсярэдзіну. Пачалі браць святыя чашы з золата ды іншыя вельмі каштоўныя рэчы.

Пачалі выходзіць з царквы, і ў той момант царква правалілася і яны разам з ёю. Потым на месцы царквы паўстала горка.

Людзі казалі: калі пойдзеш туды ноччу, то чуваць, як злодзеі енчаць. Але я таго не чуў, хоць хадзіў некалькі разоў паслухаць.

З кнігі «Белая Русь. Гісторыя Беларусі ў легендах і паданнях»



1. Што было на месцы цяперашняй горкі каля Новага Беразова?
2. Чым славілася царква?
3. Што здарылася пасля вялікага свята?
4. Якая кара напаткала злачынцаў?



5. Знайдзі на карце вёску Новае Беразова.
6. У якой гміне гэтая вёска?
7. Які гэта павет?



8. Дапоўні сказы:

Мы жывём у ..... ваяводстве. Яно ляжыць на ..... Польшчы. Сталіца нашага ваяводства – гэта горад ..... . У ім амаль ..... жыхароў. У нашым ваяводстве ..... паветаў.

Я жыву ў мясцовасці ..... . Яна знаходзіцца ў гміне ..... .

У нас ..... .

Усе літары, размешчаныя ў строгім парадку, складаюць **алфавіт**.
У сучасным беларускім алфавіце 32 літары:
А а, Б б, В в, Г г, Д д, Е е, Ё ё, Ж ж, З з, І і, й, К к, Л л, М м, Н н, О о, П п, Р р, С с, Т т, У у, ў, Ф ф, Х х, Ц ц, Ч ч, Ш ш, ы, ь, Э э, Ю ю, Я я.



9. Запішы назвы мясцовасцей у алфавітным парадку:

Зубава, Курашава, Дубічы-Царкоўныя, Бельск-Падляшскі, Шудзялава, Нарва, Маліннікі, Клюковічы, Чаромха, Лапы, Арэшкава, Ягуштова, Шпакі, Гарадок, Гайнаўка, Чыжы, Белавежа, Тэрэміскі, Рыбалы, Мельнік, Драгічын, Сухаволя, Бабікі, Семяноўка, Мора, Крынкі, Кленікі

Пра камень у Валілах



Было гэта даўным-даўно, калі людзей тут яшчэ зусім не было. Вакол цягнуліся непраходныя пушчы-лясы ды вілася сярод іх вось гэтая рэчачка. У балотнай твані сядзеў д'ябал. Бачыце, калісьці нячысты толькі ў такіх месцах і вадзіўся. Гэта цяпер адно стаў ён па гарадах шляцца. Сядзеў ён так ды з нуды корпаўся ў балоце, ажно бачыць: берагам рэчкі ідзе чалавек. Здалёку, відаць, небарака вандраваў: схуднелы ды абдзёрты ўвесь. Убачыў рэчку, прысеў на купіну, а змораныя ногі ў ваду апусціў ды пабоўтвае імі, каб хутчэй стому з іх сагнаць. А д'ябла ад злосці аж чорт носіць: «Бач ты, мала таго, што па маім беразе валочыцца, то яшчэ і мяне сваім боўтаннем непакоіць уздумаў! Чаго добрага – возьме і назаўсёды тут жыць астанецца. Ну, тут я цябе і звяду са свету».

Выкалупаў нячысты з багны каменьчык, бы зерне бобу са струка, папляваў на яго, перакінуў разы са тры з адной сваёй калматай лапы ў другую, і тут уваччу маленькі камушок у аграмадны валун абярнуўся. Пачаў размахвацца д'ябал з усяе моцы, але ж як на тое ўзяў ды паслізнуўся ў топелі, і глыба бухнула не ў чалавека, а на край лугу. Убачыў вандроўнік, чым тут пахне, – лахі пад пахі ды ходу з гэтых мясцін. А валун так і астаўся ляжаць тут. Ад таго, што чорт уваліў тут валун, і павялася назва – Валілы.

З кнігі «Белая Русь. Гісторыя Беларусі ў легендах і паданнях»

???

1. Ад чаго павялася назва Валілы?
2. Адкуль з'явіўся валун?
3. Хто замяніў каменьчык у аграмадны валун?
4. Чаму д'ябал кінуў каменьчык?
5. Дзе жыў д'ябал?

Апостраф

1. Прачытай. Параўнай вымаўленне слоў у кожнай пары.

семя – сям’я	зоры – сузор’е
пяро – пер’е	верабей – вераб’і
піць – п’юць	есці – з’есці
біць – б’юць	ехаць – пад’ехаць

2. Адкажы на пытанні да малюнкаў.



Што робіць хлопчык?



Што чытае дзядуля?



Куды схаваліся дзеці?

Для абазначэння раздзельнага вымаўлення на пісьме галосных літар е, ё, і, ю, я пасля зычных ужываецца **апостраф**.

3. Спішы, дапаўняючы сказы словамі з правага слупка.

Лёгкае ..... , а на страху не закінеш.	аб’езд
У сойкі прыгожае	сямі
Мой тата працуе з ..... гадзін раніцы.	пер’е
Паедзеш у ..... – спознішся.	пяро
У нашай ..... ўсе вучацца.	камп’ютар
Хоць лякарства і горкае, але яго	сям’і
Ён вельмі любіць свой	п’юць

Полацк



Уявіце, што на чароўнай машыне часу мы з вамі перанесліся на тысячу гадоў назад.

На месцы сённяшняга Полацка са шматпавярховымі будынкамі, шырокімі вуліцамі і плошчамі мы ўбачым на беразе Палаты зусім маленькі горад. Ён абнесены драўлянымі сценамі, абкружаны земляным валам і глыбокім ровам.

Але Полацк нам толькі здаецца маленькім. Тады ў ім жыло ажно пяць тысяч жыхароў, і ён лічыўся адным з найбуйнейшых гарадоў на славянскіх землях.

Простыя людзі сяліліся вакол гарадскіх умацаванняў, а за моцнымі сценамі жыў князь са сваімі воінамі – дружыннікамі.

Полацкія дружыны хадзілі ў ваенныя паходы вельмі далёка, ажно на Царгорад. Так у той час называўся горад Канстанцінопаль, які цяпер знаходзіцца ў Турцыі.

З летапісаў вядома, што пераможаны Царгорад плаціў палачанам даніну.

Сілу Полацка так паважалі, што аднаму замежнаму падарожніку нават здалося, што сцены вакол горада не драўляныя, а каменныя.

Уладзімір Арлоў

1. Як выглядаў тысячу гадоў назад Полацк?
2. Хто жыў за сценамі горада?

???

3. Куды хадзілі полацкія дружыны?
4. Што здалося аднаму замежнаму падарожніку?

Наша першая дзяржава



Найстаражытнейшы беларускі горад хацеў жыць вольна і незалежна. Ён стаяў на рацэ Дзвіне, па якой на караблях плылі з Чорнага мора ў Балтыйскае купцы. Яны вялі ў горадзе гандаль рознымі таварамі. Гэта дапамагала Полацку хутка багацець і рабіцца яшчэ мацнейшым. Нездарма яны казалі, што дно ў Дзвіны залатое, а берагі срэбныя.

За тысячу гадоў да нас у Полацку кіраваў князь Рагвалод. Ягонае імя некаторыя вучоныя тлумачаць як валадар рога. Відаць, бацькі назвалі яго так, марачы, каб сын быў храбрым воінам і спрытным паляўнічым. У тыя часы сігналы на паляванне падавалі з рога.

Уладу князя Рагвалода прызналі навакольныя землі крывічоў. Гэта значыць, што тады ўжо ўтварылася першая беларуская дзяржава – Полацкае княства.

З падуладных Полацку земляў у сталіцу ішла даніна – мяса і збожжа, мёд і воск, шкуры звяроў. Калі пагражалі напасці ворагі, сюды адусюль збіраліся воіны.

Уладзімір Арлоў

1. Дапоўні сказы.

Полацк хацеў жыць ..... і ..... .

Ён стаяў на рацэ ..... .

У Полацку ўладарыў князь ..... .

З падуладных Полацкаму княству земляў ішла даніна – .....

і ....., ... і ....., ...

Род назоўніка і прыметніка

1. Прачытай.

земляны вал		глыбокі роў
беларуская дзяржава		шырокая вуліца
сіняе неба		высокае дрэва

2. Складзі словазлучэнні, падбіраючы адпаведны прыметнік.

..... горад	..... паляўнічы	..... воін
..... сцяна	..... рака	..... сям'я
..... дно	..... свята	..... поле

Прыметнікі ў адзіночным ліку змяняюцца па родах. Прыметнік мае той самы род, што і назоўнік, з якім прыметнік звязаны па сэнсе.

3. З якога матэрыялу зробленыя гэтыя прадметы? Запішы назвы прадметаў і іх прымет.

..... стол, ... цвік,
..... дом, ... збан,
..... кубак, ... куртка,
..... сукенка, ... шапка,
..... чаравік, ... паліто,
..... футра

Выкарыстай словы: цагляны, драўляны, жалезны, гліняны, скураная, ваўнянае, гумовы, фарфоравы, ваўняная, льняная, штучнае.

4. Якія яны на смак? Запішы.

..... яблык, ... агурок,
..... цыбуля, ... часнок, ... лімон

5. Для чаго прызначаюцца гэтыя прадметы? Назаві прадметы і іх прыметы.

..... форма, ... садок,
..... пляцоўка, ... мяч,
..... цягнік, ... машына

Выкарыстай словы: дзіцячы, школьная, спартыўная, пасажырскі, футбольны, грузавая.

Усяслаў Чарадзей

Не легенда і не казка –
праўда з даўніны ідзе:
князем Полацкага княства
быў славуты Чарадзей –
легендарны Усяслаў
(пры жыцці легендай стаў).

Слава князю Усяславу:
мацаваў сваю дзяржаву
той, хто з роду крывічоў;
слава князю Чарадзею:
ён перамагаў зладзеяў,
што паўзлі з усіх бакоў.

Паважалі Усяслава
і свае, і чужакі:
хто – за розум,
хто – за славу,
хто – за сілу, –
свет такі.

Слава князю Чарадзею:
быў ён верай дабрадзеям,
злыдням волі не даваў,
княства так любіў заўсёды,
як жыццё і як свабоду,
пра яго да скону дбаў.

Васіль Жуковіч



1. Кім быў Усяслаў Чарадзей?
2. Якой краінай ён уладарыў?

???

3. Якім уладаром быў Усяслаў?
4. За што паважалі князя?

Пра герб і сцяг



Гербы і сцягі людзі прыдумалі даўно. Рыцары ў цяжкіх жалезных латах малявалі знакі свайго роду – гербы – на шчытах. А да вострай дзіды (кап'я) прывязвалі кавалачкі тканіны, якія і называлі сцягамі. Па гербах на шчытах і па каляровых сцягах ваяры маглі ў гарачым баі пазнаць, дзе свае, а дзе чужынцы. Лічылася, што войска, якое страціла сцяг, пацярпела паразу і пакрылася ганьбай. Таму сцяг баранілі як вока.

Мы, беларусы, адвеку шануем герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг.

Герб Пагоня прыйшоў да нас з даўніх часоў. Срэбны рыцар на кані скача па горадзе і кліча: «Пагоня! Пагоня!». Гэты кліч азначаў, што на мірную беларускую зямлю напалі чужынцы, і ўсе мужчыны павінны стаць на яе абарону, разбіць ворага і гнаць аж да мяжы.

У правай руцэ рыцара меч, у левай – шчыт з залатым крыжам. Шасціканцовы крыж – гэта знак добрага і цёплага Сонца-Ярылы.

Наш сцяг мае тыя ж колеры, што і герб. Так і трэба па правілах.

У розных краін – розныя гербы і сцягі. Па гербах відаць, якія знакі мужнасці, справядлівасці, магутнасці шануюць у гэтай краіне.

Герб Чэхіі – леў, на гербе Швецыі тры залатыя кароны, палякі маюць на гербе арла, а на гербе далёкай Аўстраліі бачым кенгуру і страўса. Сцягі вывешваюць і падымаюць на святы. Людзі шануюць сцягі сваіх краінаў. Напрыклад, шведы штораніцы ўзнімаюць над дамамі свой шведскі сцяг – залаты крыж на блакітным палотнішчы. Вельмі любяць свой зорна-паласаты сцяг амерыканцы і нават спяваюць пра яго песні. Украінцы маюць блакітна-жоўты сцяг, рускія – бела-сіне-чырвоны, немцы – чорна-чырвона-жоўты.

Для нас, беларусаў, сярод усіх сцягоў найпрыгажэйшы наш сцяг – бел-чырвона-белы. Ён прыкметны здалёк, ён такі светлы і лёгкі, быццам ляціць у нябёсах.

Беларусы адвеку шанавалі белы і чырвоны колеры. Белы – колер чысціні, свабоды і веры, колер спакойнай вады. Можа таму і называемся БЕЛАРУСЫ, што любім свабоду і чысціню.

Пра беларускі сцяг кажуць: ён – быццам гронка каліны на белым снезе. А памятаеце, як вышыты нашыя народныя кашулі, вытканы ручнікі? Чырвонымі ніткамі па белым. Чырвоны колер – гэта колер смеласці ды адвагі, колер палкага агню. Вось і атрымліваецца, што беларускі сцяг як беларуская душа. Беларус – спакойны, мудры, верны слову чалавек, але калі краіна ў бядзе, ён бярэцца за зброю і бароніць Бацькаўшчыну.

Вінцук Вячорка

1. Як выглядае беларускі герб Пагоня?
2. Як выглядае беларускі сцяг?

???

3. Што сімвалізуе чырвоны колер?
4. Што абазначае белы колер?
5. Які характар беларуса?

З вялікай літары пішуцца словы **Айчына, Радзіма, Бацькаўшчына**, калі яны ўжываюцца ў значэнні дзяржавы. З малой літары пішуцца назвы нацыянальнасцяў: *беларус, паляк, украінка, шатландка, немец, француз.*

6. Раскажы, гербы і сцягі якіх краін ты ведаеш.

Гуканне вясны



Гэта старажытнае свята развітання з зімой і сустрэчы вясны. Людзі заклікаюць вясну хутчэй прыйсці, радуюцца першаму вясновaму сонцу і праганяюць зіму.

Гуканне вясны пачыналася 14 сакавіка. Апоўдні моладзь збіралася гуртам ды ішла на ўзвышша. Высокае месца выбіралі таму, што яно першае вызвалялася з-пад снегу.

Хлопцы збіралі з усяе вёскі розную старызну і зносілі яе ў адно месца. Распальвалі вогнішча. Нараджэнне новага магчыма толькі праз адміранне старога. Хлопцы ачышчалі зямлю, а дзяўчаты поўнілі яе песнямі-гуканнямі.

Спевы вяснянак і гукальных карагодаў на ўзгорках суправаджаліся падкідваннем уверх печыва ў выглядзе жаўрукоў, кулікоў, буслоў, што павінна было вызваць хутчэйшы надыход вясны.

Да нашага часу на Беласточчыне пад Благавешчанне пякуць «буславу лапу».

1. Як людзі гукаюць вясну?
2. Дзе моладзь адзначала гэтае свята?

???

3. Што рабілі хлопцы?
4. Чым займаліся дзяўчаты?
5. Што такое «буслава лапа»?

Красавік



Ці ведаеце вы, чаму ў Красавіку так хораша і столькі красак? Ды таму, што Красавік – мастак.

Быў час, калі Красавік самы першы раз прыйшоў на зямлю. І не спадабалася яму пасля зімы пажоўклая трава, шэрае неба, чорная зямля... І рашыў ён усё-ўсё перафарбаваць.

Узяў Красавік фарбы і пэндзаль і перш-наперш памаляваў неба ў сіні-сіні колер, а на ім белыя-бялюткія аблокі. Затым перамаляваў палі. Дзе зялёнай, дзе жаўтаватай, дзе шэрай фарбай мазнуў. Лугі вымаляваў у ясна-зялёны колер, а на тых лугах-мурагах давай пырскаць то блакітнай, то жоўтай, то белай, то ружовай фарбамі...

І якіх толькі красачак не з'явілася на лузе! Аж у вачах мільгаціць.

– Ну, а цяпер падамся ў лясы, – сказаў Красавік, – гляну, што там трэба падмаляваць.

І падаўся ў лес.

– Эгэ-гэ-гэ! – загукаў ён. – Сосны, яліны! Вольхі, асіны! Дубы, ясені! Ліпы, клёны, бярозы! Усе, хто зможа, ідзіце да мяне!

І пайшлі да Красавіка дрэвы, а ён каму чырвоны камель намалюе, каму жаўтаваты, каму карычневы, шэры, чорны, срабрысты... Амаль усе фарбы вымаляваў, аж стаміўся.

А тут прыбегла да яго Бярэзінка, задыхалася, ледзь стаіць з апушчаным веццем.

Глянуў Красавік, а ў яго ўсяго толькі адна белая фарба асталася.

– Будзеш белаю, – кажа Бярэзінцы.

– Няхай белаю, толькі не чорнаю... Не хачу быць чорнаю!

А да гэтага Бяроза чорнаю была.

Пачаў Красавік маляваць Бярозу ў белы колер, але фарбы не хапіла, дык сям-там чорныя лапікі асталіся.

Адышоўшы, глянуў на сваю работу: стаіць сярод чырвоных сосен ды шэрых ялін белая-бялюткая Бярозка, нібы тая дзяўчынка ў белай сукеначцы.

І такая яна стала прыгожая, што Красавік ажно засмяяўся. Адклаў ён убок свае фарбы і пэндзаль, выразаў з вербалозу дудку, сеў пад Бярозаю ды зайграў.

І так прыгожа, што ў Бярозы аж слёзы пакаціліся.

І цяпер, бывае, вясною сядзіць Красавік пад Бярозкаю і грае на дудачцы. Пайдзіце ў вясновы лес, прыслухайцеся, можа, і сустрэнецеся з Красавіком. І на Бярэзінку паглядзіце... Стаіць яна, апусціўшы вецце, слухае песню Красавіка, і часам капне на зямлю празрыстая бярозавая слязінка.

Але бярозавыя слёзы не салёныя, а салодкія, бо плача яна не ад гора, а з радасці.

Клаўдзія Каліна

1. Чаму аўтарка называе Красавік мастаком?
2. Як мяняецца прырода ў красавіку?
3. Ці ведаеш, што такое «бярозавыя слёзы»?
4. Знайдзі ў тэксце апісанне бярозкі. Прачытай.
5. Прачытай словы ў парах:

салёныя – салодкія
белая – чорная
гора – радасць
плач – смех

6. Якое значэнне маюць словы ў парах: блізкае ці процілеглае?

Словы з процілеглым значэннем называюцца **антонімамі**:
ціхі – гучны, гарачы – халодны.

Антонімы

1. Прачытай. Падбяры антонімы да выдзеленых слоў.

Каб адкуль-небудзь **выйсці**, трэба спачатку туды ..... .
У красавіку ночы яшчэ **халодныя**, але дні ўжо ..... .
На **поўначы** раслінны і жывёльны свет не такі, як на ..... .
Вечарам сонца **заходзіць**, а ....
Вясёлым людзям жывецца лягчэй, чым ..... .

2. Падбяры антонімы да выдзеленых слоў.

лёгкі заплечнік	–	..... заплечнік
высокае дрэва	–	..... дрэва
вялікая праблема	–	..... праблема
шырокі калідор	–	..... калідор
салодкі шакалад	–	..... шакалад
цвёрдае крэсла	–	..... крэсла

3. Падбяры антонімы да прыметнікаў:

невядомы – ..... дужы – .....
дрэнны – ..... хуткі – .....
цяжкі – ..... прыгожы – .....

4. Разгледзь малюнкі. Што робяць дзеці?



Хлопец .....



Хлопец .....

Дзяўчынка .....





Дзяўчынка .....

Вясна

То не снег,
То чаромха цвіце.
То не снег,
То бярозка расце.
То не снег –
Расцвітае садок.
То не снег,
А ляціць матылёк.
То не шоўк –
Гэта рунь ля гары.
То не шоўк,
А сон-цвет у бары.
То не шоўк,
А мурожны лужок,
То не шоўк –
Маладзенькі лянок.
Не гусляр –
То пяюць салаўі.
Не гусляр –
То звіняць ручаі.
Не гусляр –
Дрозд у гаі пяе.
Не гусляр –
Гэта пчолка гудзе.
Ах, вясна
Маладая мая!
Пад табой
Ажывае зямля.
Пад табой
І звініць і пяе
Нават жук...
Нават мушка ў траве.

Змітрок Бядуля



??? **1.** Які настрой перадаў паэт у вершы?
2. Якія прыметы ў прыродзе сведчаць пра надыход вясны?

3. Прачытай, як пра гэта гаворыць аўтар.

Фіялка



Увесну пад старою ліпаю расцвіла маленькая Фіялка. Яна з цікавасцю паглядзела навокал і ўбачыла, што ўсе яе суседкі яркія і высокія і над імі кружацца прыгожыя матылькі. А да яе, маленькай кветкі, ніхто не прылятаў, і яна самотна цвіла ў густой траве.

– Ах! – жаласна ўсклікнула Фіялка. – Чаму я такая няшчасная? Ніводзін матылёк не можа знайсці мяне. Лепш бы я зусім не цвіла.

І раптам яна пачула прыемнае гудзенне... Гэта Пчала закружылася над ёю і апусцілася на сінія пялёсткі.

– Як ты мяне знайшла? – спытала радасна кветка. – Я ж такая маленькая і непрыкметная!

– У цябе цудоўны пах, – прагула Пчала.

– Няўжо? – здзівілася Фіялка. – Нават лепшы, чым у тых жоўтых?

– Лепшы. Ты самая цудоўная з ранніх кветак. І я часта буду прылятаць да цябе.

Пчала дакранулася да кветкі, узяла кропельку нектару і паляцела ў вулей.

І маленькая Фіялка яшчэ пышней расцвіла, павесялела. Яна адчула сябе самай шчаслівай на веснавой зямлі. Пчала абмінула многа яркіх высокіх кветак, а знайшла яе, маленькую, непрыкметную, у траве.

Клаўдзія Каліна

???

1. Хто герой гэтай казкі?
2. Чаму Фіялка лічыла сябе няшчаснай?
3. Калі Фіялка адчула сябе самай шчаслівай кветкай?

4. Знайдзі сказы, якія апісваюць выгляд Фіялкі.

5. Нарысуй гэтую кветку.

Пралеска

Белыя бярозы
спалі на ўзлеску,
як сваю галоўку
узняла пралеска.
Тоненькую ножку
з-пад пярыны белай
на зямлю пралеска
ставіла нясмела.
А снягі наўкола -
ні канца, ні краю.
Страшна стала кветцы:
«Я адна – жывая».
Кажа зверху сонца:
«Зорачка лясная,
з новым нараджэннем
я цябе вітаю!»
Белыя бярозы
разам зашапталі:
«Мы цябе, пралеска,
усю зіму чакалі».
І старая елка
голасна ўздыхнула:
«Вясна надыходзіць,
а зіма мінула».

Вера Вярба



???

1. Калі вырасла пралеска?
2. Як сонца сустрэла кветку?
3. Што сказалі кветцы бярозы?
4. Што сказала ёй старая елка?
5. Колькі строф у вершы?
6. Колькі радкоў у кожнай страфе?
7. Якія радкі рыфмуюцца?

8. Прачытай пары слоў, якія рыфмуюцца.

Дзеці на парашутах



Вясною, як толькі прыгрэла сонейка, яна першаю выглянула з сухой леташняй травы і адразу расцвіла жоўтым цветам. Азірнулася вакол, бачыць: выглянулі з травы і расцвілі іншыя кветкі – маленькія жоўтыя сонейкі.

– Гэта мае сваякі, – сказала кветка, і ёй стала радасна, што яна не адна на свеце.

Але з кожным днём прыгравала сонейка, і кветка пачала сівець. Замест жоўтай зрабілася белай-белай.

– Што ж цяпер будзе? – спалохалася яна, бо ўбачыла, што ўсе яе сваякі таксама белыя. Чуе кветка: ляціць цяжкі касматы чмель. Яна ведала гэтага чмяля. Ён часта лятаў тут і гудзеў сваім тоўстым голасам, збіраў мёд і ніколі не мінаў яе пялёстачкаў.

– Што будзе? – трывожна спыталася кветка. – Няўжо я загіну і загіне ўся мая радня?

Мудры чмель ёй сказаў:

– Не палохайся. На той год закрасуеш ізноў. Толькі трэба зрабіць так, каб твае дзеці разляцеліся як мага далей.

– А як мы разляцімся? У маіх жа дзетак няма крылаў?

Мудры чмель думаў-думаў і нічога не прыдумаў.

– Думай сама, – сказаў ён. Загуў як самалёт і паляцеў.

Доўга думала кветка-дзьмухавец і нарэшце радасна ўсклікнула:

– Прыдумала! – і пачала кветка-маці шыць сваім дзеткам белыя шаўковыя парашуцікі. І толькі дзьмухнуў ветрык, паляцелі сынкі і дачушкі – кожны на сваім белым парашуціку. І кожны стараўся адляцець далей. Хто дзе ўпаў – там і заснуў да будучай вясны. А як толькі пасля зімы прыгрэла сонейка, прачнулася маці, глянула – а навокал жоўта ад кветак.

– Як я добра прыдумала! – радасна сказала кветка-маці.

Васіль Вітка

???

1. Калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў творы?
2. Хто герой гэтага апавядання?
3. Чаму кветка хвалявалася?
4. Што ёй параіў чмель?
5. Што прыдумала кветка-маці?
6. Што здарылася праз год?
7. Якія веснавыя кветкі ты ведаеш?

8. Знайдзі ў тэксце ўсе словы з «ў». Растлумач, чаму яны так пішуцца.

9. Прачытай. Устаў гукі ***у*** ці ***ў***.

дзя..чынка, з..б, р..ка, сяброо..ка, а..торак, за..тра, жо..ты, к..ток

10. Змяні словы так, каб у сярэдзіне іх было ***ў***.

трава – траўка
карова – .....
слiва – .....
дрэва – .....
лава – .....
морква – .....

11. Змяні словы так, каб у канцы было ***ў***.

заснула – заснуў
чакала – .....
часала – .....
жыла – .....
ведала – .....
сушыла – .....
піла – .....
спала – .....
грэла – .....

Хадзіла вярба...

Хадзіла вярба,
Дзе дзяцей гурба,
Наравістых выбірала,
Наравы выганяла.
Пястуху-дзяўчынку
Шлёгала галінкай,
З дураслівым хлапцом
Гаварыла дубцом:
– Наравы, наравы,
Ідзіце на равы,
На ямы ваўчыныя –
Ад натуры дзяцінае.
Там з вятрамі
гайсайце,
А дзяцей не чапайце.
Хай растуць –
не маркоцікі –
Слухмяныя,
Як вярбовыя коцікі,
Рахманыя...

Так вярба прамаўляла,
Так дзяцей навучала –
Ад дурноты пазбыцца,
Ад ляноты лячыцца, –

У Вербную нядзелю,
На добрую надзею...

Васіль Зуёнак



???

1. Які настрой у гэтым вершы?
2. З якім святам звязаны гэты верш?
3. Што гаварыла дзецям вярба?
4. Чаму вучыла дзяцей вярба?



Вялікдзень, або Пасха, – гэта самае значнае і ўрачыстае свята, якое адзначалася старажытнымі славянамі ў гонар сонца, абуджэння прыроды і надыходу палявых работ.

У залежнасці ад месяцовага календара яно прыпадае на час ад 4 красавіка да 8 мая.

Гэтае свята праслаўляе цудадзейнае ўваскрэсенне Ісуса Хрыста, які быў пакараны распяццем на крыжы.

Гэтай падзеі – цудоўнаму вяртанню да жыцця Ісуса Хрыста – прысвечаны разнастайныя хрысціянскія звычаі і абрады на Вялікдзень. У велікодны час прынята вітацца словамі: “Хрыстос Уваскрос!”

Падрыхтоўка да Вялікадня адбываецца на працягу Перадвелікоднага тыдня і заканчваецца ў Вялікую суботу. Напярэдадні Вялікадня гатуецца, варыцца, смажыцца мноства розных страў. Пякуцца пірагі, фарбуюцца ў розныя колеры і распісваюцца ўзорамі курыныя яйкі (пісанкі). Святочную ежу людзі нясуць у царкву, дзе гэтая ежа ў час службы асвячаецца.

Пасля літургіі пачынаецца святкаванне. Сямейнікі разгаўляюцца асвячоным яйкам, потым іншай асвячонай ежай.

Любімая гульня ў дзяцей і моладзі — біткі. Яны стукаюцца велікоднымі яйкамі, і пераможцам аказваецца той, у каго яно застаецца цэлае («мацак»).

Раней па хатах хадзілі групы валачобнікаў і спявалі валачобныя песні з пажаданнем плёну на ніве, прыплоду ў статку, добрага здароўя, шчаслівае долі, велічалі гаспадароў і руплівую працу.

Праз тыдзень пасля Вялікадня адбываецца памінанне памерлых родзічаў — веснавыя Дзяды Радаўніца.

Свет звяроў і птушак

Травень

Травень, ты – вясны вяршыня.
Ззяе сонца ў небе сінім.

Канюшына і рамонкі
разліваюць водар тонкі.

Пахне мята з медуніцай.
Надыходзіць касавіца.

На палях, цяплом абжытых,
закрасуе хутка жыта.

А сады – на заглядзенне:
дрэваў пышнае цвіценне.

Замірае нават вецер
перад яблынямі ў цвеце.

І чмялі гудуць, і пчолы;
птушак спеў чуваць вясёлы.

Ад світання да змяркання –
трэлі, шчэбет і куванне.

Васіль Жуковіч



???

1. Чаму травень – вяршыня вясны?
2. Як разумееш словы «водар тонкі»?
3. Як разумееш словы «палі цяплом абжыты»?
4. Пра якія кветкі і зёлкі піша аўтар верша?
5. Што адбываецца ў садзе?
6. Чые галасы чуем у траўні?

Хто які голас падае?



Бусел клякоча.



Варона каркае.



Салавей цёхкае.



Верабей чылікае.

Шпак свішча.





Зязюля кувае.



Сініца цінькае.

Бусел верны Беларусі

Бусел з Афрыкі гарачай
Родную зямельку ўбачыў.
Зноўку з выраю вярнуўся
Да айчыннай Беларусі.

Ён з бусліхай-прыгажуняй
Распазнаў гняздо на клуні.
Хутка ў буслоў цыбатых
Будуць дзеці-бусляняты.

Дзеці вырастуць праз лета
І пакінуць свой палетак.
Прыляцяць увесну. Бусел
Заўжды верны Беларусі.

Віктар Швед



??? **1.** Адкуль вяртаюцца буслы ўвесну?
2. Чаму яны туды ляцяць?
3. Чаму бусел «заўжды верны Беларусі»?

4. Паспрабуй апісаць бусла. Карыстайся здымкам і планам.



Хто гэта?	птушка, бусел
Велічыня	вялікі, вялікая
Размалёўка	чорна-белы, белыя, чорныя, чырвоныя

Пабудова

галава	малая, цёмныя вочы, белая, вострая і доўгая дзюба, доўгая і тонкая шыя
тулава	авальнае, белы жывот, чорныя і вялікія крылы
хвост	доўгі
ногі	доўгія, чырвоныя
дзе жыве	побач з хатамі людзей
ежа	есць насякомых, паўзуноў
Што пра яго думаеш?	прыгожы, памагае людзям, карысны, верны



1. Падбяры і запішы адпаведныя словы.

ВЯЛІКІЯ	малыя
дуб	.....
.....	птушачка
дрэва	.....
нага	.....
.....	кусцік
.....	гняздзечка
дождж	.....
.....	галоўка
вочы	.....
хвост	.....
рот	.....
нос	.....
.....	вушкі

Добры дзяцел

(Англійская народная казка)



Ці ведаеце вы, што калісьці ў лесе было зусім ціха. Птушкі не ўмелі спяваць.

Адзіным спеваком быў вецер. Ён шумеў у лісці, скрыпеў галінамі дрэў.

І вось аднойчы сабраліся птушкі і пачалі размяркоўваць паміж сабою песні. Кожная з іх хацела атрымаць самую прыгожую.

– Мне хацелася б мець самую пяшчотную песню, – сказала галубка.

– А я ўзяў бы што-небудзь вясёленькае, – сказаў чыж.

Зязюля папрасіла, каб ёй далі што-небудзь незвычайнае.

Толькі шэры салавейка самотна сядзеў і сціпла маўчаў.

«Няўжо мне нічога не пакінуць? – думаў ён. – Мая жонка так любіць музыку!..»

Дзяцел у гэты дзень аглядаў і лячыў бярозкі ў лесе. Увечары ён скончыў свой абход, прыляцеў на сходку і папрасіў:

– Дайце мне, калі ласка, прыгожую песню. Я заўсёды буду вітаць ёю ўсход сонца.

Яму далі песню. Самую доўгую і самую прыгожую. Але раптам ён заўважыў салаўя.

– А якую песню табе далі? – спытаў дзяцел. – Праспявай яе мне, калі ласка.

– У яго няма песні! – хорам закрычалі птушкі. – Ён нічога не прасіў.

Шкада стала дзятлу салаўя, і ён аддаў яму сваю песню – самую доўгую і самую прыгожую.

Таму дзяцел ніколі не спявае. Але ўсе птушкі любяць і паважаюць яго.



1. Што рабіў спявак-вецер?
2. Якую песню атрымала галубка?
3. Якую песню атрымаў чыж?
4. Якую песню папрасіла зязюля?
5. Якую песню хацеў дзяцел?
6. Што са сваёй песняй зрабіў дзяцел?
7. Як ты ацэньваеш учынак дзятла?



8. Знайдзі прыметнікі ў казцы. Запішы іх.



9. Вызначы род запісаных прыметнікаў.



10. Утвары прыметнікі ад назоўнікаў паводле ўзору.

дрэва – драўляны	сябра – сяброўскі	птушка – птушыны
жалеза –	каханне –	бусел – .....
лён –	зелень –	луг – .....
бяроза –	вясна –	сонца – .....
жыта –	кветка –	мора – .....

Сарока-манюка



Жыла-была Сарока.

Лятала па лесе зялёным, стракатала без угамону. Але ўсім было вядома, што яе стракоткі-бразготкі – звычайныя плёткі. Як кажуць, чула звон, ды не ведае, дзе ён. І таму яе крык ніхто не браў у разлік.

Хто ведае, колькі б так цягнулася яно, каб не здарылася няшчасце адно. За нейкі птушыны грэх як кару нагнаў вецер на лес хмары. Гром грукоча, аж трасецца дом сарочы. І маланкі б'юць – слепяць звысоку – проста жах бярэ Сароку.

Сядзіць яна ў гняздзе, прыціхла – хутчэй бы прайшло гэта ліха! Аднак бяда не мінула гнязда. І ўспыхнула мілае гняздзечка як свечка.

Узнялася з гнязда Сарока, крычыць-лямантуе белабока:

– Птушкі і птушаняткі, гарыць мая хатка! Набярыце ў дзюбы вады – і хутчэй сюды, дзе маланка з-пад хмар мне прынесла пажар!..

Чуюць птушкі лямант сарочы, толькі веры даць не хочуць.

Бо сарочыя плёткі ім вядомыя ўсё-ткі.

Так і згарэла гняздо. Датла.

І ўсё таму, што манюкай Сарока была.

Анатоль Зэкаў

???

1. Якая была Сарока?
2. Якое няшчасце яе спаткала?
3. Чаму птушкі не дапамаглі Сароцы?
4. Як напісана казка?
На што яна падобная?

5. Знайдзі і запішы рыфмаваныя выразы з тэксту.

6. Дапоўні сказы.

Хітры як ..... .
Працавіты як ..... .
Здаровы як ..... .
Упарты як ..... .
Верны як ..... .
Баязлівы як ..... .
Хуткі як ..... .

7. Прачытай спалучэнні слоў. Растлумач іх значэнне.

салодкі мёд – салодкі сон
каменны круг – каменнае сэрца
кучаравыя валасы – кучаравыя вербы
свежы хлеб – свежае паветра

8. Прачытай прыказкі.

З малой іскры бывае вялікі пажар.
З вялікай хмары малы дождж бывае.
Праўда халодная, а мана цёплая.
Цяжкая праца, лёгкі хлеб.

9. Як разумееш сэнс гэтых прыказак?

10. Знайдзі ў прыказках процілеглыя па сэнсе прыметнікі.

11. Падбяры да прыметнікаў антонімы.

кароткі – .....
ветлівы – .....
дарагі – .....
разумны – .....
гаваркі – .....
звонкі – .....
лянівы – .....
прыгожы – .....

Зубры ў Белавежскай пушчы



Мы паехалі ў Белавежскую пушчу паглядзець зброў. Спыніліся на адным узгорку, чакаем. Хутка прыехаў ляснічы і сказаў:

– Хавайцеся, леснікі гоняць сюды чараду зброў.

Скокнулі мы за тоўстыя дрэвы, углядаемся. Чуем: моцна трашчыць сухое галлё і кусты.

Неўзабаве ў зарасніку замільгалі дзве чорныя тушы. Яны то поруч, то паасобку беглі проста на нас. Гэта былі старыя самцы. Іх лёгка пазнаць: шырокія рагатыя іхнія ілбы надта зараслі доўгай шэрсцю, якая звісала ўніз барадою.

Зубры, відаць, убачылі нас ці можа пачулі нюхам. Яны абмінулі ўзгорак і, лёгка пераскокваючы цераз паваленыя на зямлі дрэвы, зніклі з вачэй.

Праз некалькі хвілін таксама бокам прамільгнула яшчэ некалькі зброў.

Разгледзець як мае быць гэтых выдатных жыхароў пушчы мы змаглі толькі ў звярынцы. Былі там старыя самцы, маладыя бычкі і самкі з цялятамі. Маладыя цяляткі, чорныя як жукі, бязрогія, смешныя, з шырокімі ілбамі і шырокім перадам, з вузкім целам, хутка бегалі за сваімі маткамі і мычэлі.

Валянтына Пашкевіч

???

1. Дзе жывуць зубры?
2. Знайдзі сказы, якія апісваюць зброў.
3. Чым адрозніваюцца цяляты ад дарослых зброў?

Свойскія жывёлы



1. Разгледзь малюнак.

2. Якіх звяроў разводзяць гаспадары?

3. Дапоўні радкі з назвамі звяроў паводле ўзору.

гусь	гусак	гусяня
певень	.....	.....
.....	качка	.....
.....	індычка	.....
бык	.....	.....

.....	кабыла	.....
кот	.....	.....
.....	сучка	.....
кныр	.....	.....

4. Запішы, хто дзе жыве.

Высока на дрэве буслы пабудавалі свае ..... .
Ластаўкі зляпілі ..... пад страхою нашай ..... .
Вавёрка схавалася ў ..... .
Карова хоча выйсці са свайго ..... .
Коні начавалі ў ..... .
Месца, дзе спяць куры, – гэта ..... .
Трусы не выходзяць з ..... .
У сабакі салідная драўляная ..... .
Малая мышка мае сваю ..... .

Жыў-быў вожык



Нашага вожыка тата злавіў у лесе і прынёс у кішэні дахаты. Спачатку вожык ляжаў, як клубок. Як паклалі яго ў кутку, пад маім ложкам, так ён і ляжаў. Я наліў яму ў сподачак малака. А вожык хоць бы што. Тады я лёг побач з ім на падлозе і пачаў назіраць.

На дварэ змяркалася, і пад ложкам рабілася цёмна.

– Дурненькі ты, – сказала мама. – Ты яго толькі не чапай, ён малако знойдзе.

І праўда, толькі я лёг у ложак і ў хаце зрабілася ціха, як у куточку пад ложкам нешта ціхенька заварушылася і зачмыхала:

– Ту-ту-ту-пых! Ту-ту-ту-пых!

А потым на дошках падлогі затупалі маленькія мяккія ножкі.

– А што, не гаварыла я, – сказала мама. – Не палохай, ён малако пачне хлябтаць.

І праўда, мы памаўчалі, і неўзабаве пачулася, што нехта маленькі хлебча. Не так, як кот, а так, як парасяты, плямкае. Вожык тупацеў усю ноч, і за гэта мы пачалі называць яго Тупцікам. А за тое, што ён перастаў нас баяцца, я не забываўся даваць яму есці.

Але не было з кім Тупціку пасябраваць. І стала яму сумна ад гэтага. Каб развесяліць вожыка, я зняў аднойчы са сцяны люстэрка і паставіў на падлозе. А вожык падышоў да люстэрка, наставіў лычык, паглядзеў і надзьмуўся. А той, што ў люстэрку, надзьмуўся таксама, і вось яны разам зрабілі:

– Пых!

Мы засмяяліся – і тата, і я, а Тупцік паглядзеў, асцярожненька дакрануўся лычыкам да шкла і як быццам усё зразумеў. Адышоўся і больш не глядзеў у люстэрка.

А мы занеслі Тупціка ў агарод. Яму цяпер весела, добра на волі.

Янка Брыль

???

1. Ці спадабалася табе апавяданне?
2. Адкуль у хлопца з’явіўся вожык?
3. Як вожык піў малако?
4. Як назвалі вожыка? Чаму?
5. Як адчуваў сябе вожык?
6. Чаму вожыка занеслі ў агарод?

Дзікі



У свойскіх жывёл у лесе ёсць сваякі. У кошкі – рысь, у сабакі – воўк... Аднак я не раіў бы сабаку і кату трапляць на вочы сваім лясным суродзічам. Драпежнікі сваяцтва не прызнаюць, для іх найлепшы прыяцель той, каго лёгка з'есці.

У свіней таксама жывуць у лесе сваякі. Называюцца яны – дзікі. Дзікі не драпежныя жывёлы, але ўсё-ткі звяры. У іх зусім іншае жыццё, чым у рахманых вясковых свінак, што не ведаюць ні холаду, ні голаду. А вось іх лясным родзічам нярэдка даводзіцца туга, асабліва зімой, калі насыпле гурбы снегу і трашчыць мароз. Паспрабуй, падсілкуйся карэннем раслін, калі зямля нібы ўкамянела. Добра, што дзікі жывуць вялікім дружным статкам. Недарэмна ёсць прымаўка: дзе грамада, не страшна бяда. Старыя ікластыя вепрукі першыя капаюць зямлю, потым ім пасабляюць падсвінкі. Глядзіш – і ўсе пад'елі. Падмацаваўшыся, дзікі спяшаюцца ў зацішак на ўскрайку лесу. Наперадзе – самы дужы вяпрук, якога праз вострыя іклы паляўнічыя называюць секачом. Сякач пракладвае ў глыбокім снезе сцежку, а ўжо за ім бяжыць увесь статак. Ад калючага марозу дзікі таксама ратуюцца гуртам: прыціснуцца шчыльна адзін да аднаго і адпачываюць. Маладыя падсвінкі спяць, а старыя, залёгшы вакол маладняку, нясуць пільную варту. Пачуюць небяспеку – зараз жа падхопяцца на ногі, пабудзяць статак.

Найпершы вораг лясных свіней – ваўкі. Часцей за ўсё шэрыя разбойнікі нападаюць на маладых дзікоў. Старых вепрукоў яны баяцца, бо секачы здатны пабарукацца нават з мядзведзем.

У канцы красавіка – пачатку мая ў дзікіх свіней з'яўляюцца парасяткі. Рыжанькія, з цёмнымі палоскамі ўздоўж цельца, што памагае ім імгненна хавацца ў траве і хмызняку. Парасяткі растуць жвавыя, дужыя. І нядзіўна: вясною і летам ім хапае корму, бо зямля ажно захлынаецца сакавітай зелянінай. Потым надыходзіць восень, з дубоў сыплюцца жалуды – найлепшы ласунак. Дзякуючы жалудам дзікі нагульваюць шмат тлушчу, што вельмі прыдасца ў бяскорміцу і халады.

А яшчэ восенню можна ўдосталь наесціся бульбы. Таму ледзь толькі сцямнее – дзікі спяшаюцца на бульбяныя палеткі. За ноч яны так папрацуюць лычамі, што потым не знайсці разораў. Людзі, якія пасадзілі бульбу, вядома, не рады такой дапамозе...

Валянтына Пашкевіч

???

1. Што ядуць дзікі?
2. Як яны шукаюць корму зімою?
3. Як яны жывуць зімою?
4. Дзе дзікі спяць зімою?
5. Хто найпершы вораг дзікоў?
6. Калі з'яўляюцца парасяткі?
7. Як выглядаюць парасяткі?
8. Чым кормяцца дзікі восенню?
9. Якія звяры жывуць у нашых лясах?

???

10. Адгадай загадкі.

У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла –
сляды замяла.

Гальчастыя рогі,
хуткія ногі,
колер поўсці — залаты.
Хто я, ці ведаеш ты?

Мышак ловіць, ды не коцік ён,
І лісты носіць, ды не паштальён.
Каб лісе не трапіць на зубок,
У калючы скруціцца клубок.

Адгадайце, хто такі
На нагах гусіных
Сярод быстрае ракі
Збудаваў плаціну.

Ён прысмакаў з'еў нямала,
а калі харчоў не стала,
лапу смокчучы, заснуў,
ледзьве не праспаў вясну.

З ялінкі на ялінку,
з галінкі на галінку
паштальён.
скача агеньчык жывы...
Хто гэта? Знаеце вы?

МАМА



Імя маёй мамы
Самае лепшае,
Маміна слова
Найдаражэйшае.

Свеціць, як сонца,
Ад самай калыскі.
Вобраз матулі
Родны нам, блізкі.

Дзе б ты ні быў,
А яго прыгадаеш.
Мама заўсёды
Нам шчасця жадае.

Маміна свята
Дорага людзям.
Хай яно светлым
І радасным будзе.

Мікола Хведаровіч

??? **1.** Чаму вобраз мамы нам родны і блізкі?
2. Чаму людзі шануюць маміна свята?

!!! **3.** Вывучы верш на памяць.

4. Запішы сказы пра сваю маму.

Маю маму завуць ..... .
Яна працуе ..... . У маёй мамы ..... вочы і ..... валасы.
Мая мама любіць ..... колер. Яна часта ..... . Люблю разам з мамай ..... .

5. Зрабі маме віншавальную паштоўку і запішы пажаданні.

Дарагая (любімая) мама!

Віншую Цябе з Тваім святам. Жадаю ....., ..., ...

Твая дачка ..... Твой сын .....

Якія кветкі падараваць маме?



флёксы



астры



касачы



настуркі



вяргіні



ружы



півоні



ландышы



хрызантэмы



наготкі

Чэрвень і Сонейка



Бегае Чэрвень з самага ранку і да вечара па садах, палях, лясах і ні ўпынку, ні адпачынку яму няма. Усюды трэба паспець, усё дагледзець.

Не паспеў абабегчы ўсе сады, паглядзець, ці добрая завязь на дрэвах, як на поле пара: на жыта зірнуць, падрасціць лён, каб даўжэйшы рос, папрасіць ветру, каб прыгнаў хмару з дажджом ды астудзіў ад спякоты зямлю... А тут яшчэ трэба ў лес завітаць, дагледзець сунічкі і другія ягады, павярнуць іх да Сонейка, каб сокам наліваліся. А Сонейка ўжо на схіле, хутка і вечар...

– Ох, які кароткі дзень! – скардзіцца Чэрвень. – Сонейка, памажы мне, святі даўжэй.

Сонейка слухае Чэрвеня і кожныя суткі ўсё болей прыбаўляе дня.

Чэрвень за дзень усюды пабывае: паглядзіць, як у лесе даспяваюць сунічкі, загляне ў вожыкаву схованку, пацікавіцца, як гадуюцца малыя важаняткі, і ў гнёзды птушыныя зазірне. Так за турботамі не заўважае, як бяжыць час. І вось чутна, як звіняць на лузе косы, пачалася касавіца. Новыя клопаты ў Чэрвеня.

– Сонейка, будзь ласкава, прыбаў яшчэ дня! Людзям сена трэба высушыць, – просіць зноў Чэрвень.

Сонейка слухала Чэрвеня, прыбаўляла дня, прыбаўляла ды і перастала.

– Усё! – кажа. – Болей не магу прыбавіць ні хвілінкі. Ночка крыўдзіцца, зусім кароценькая стала. Не паспее заснуць неба на захадзе, як ружавее на ўсходзе!

– І за гэта дзякуй! – кажа Чэрвень. – І так ты мне памагло.

Я і садавіну падгадаваў, я і жыта выкасіў, і лён падрасіў, ягады сокам паліў... І шмат іншай работы зрабіў. Не сорам майму брату Ліпеню будзе ў вочы глянуць.

Вось чаму ў Чэрвеня самы доўгі дзень і самая кароткая ноч. Гэта Сонейка дружыць з Чэрвенем і памагае яму.

Клаўдзія Каліна

1. Чым займаецца Чэрвень?
2. Хто і як дапамагае Чэрвеню ў яго справах?
3. Чаму ў чэрвені самы кароткі дзень і самая доўгая ноч?

4. Прачытай сказы.

Чэрвень (што рабіў?) ... па садах, палях, лясах. У полі ён (што зрабіў?) .... на жыта. Пасля таго Чэрвень (што зрабіў?) ... ветру, каб той (што зрабіў?) ... хмару з дажджом і (што зрабіў?) ... ад спякоты зямлю. У лесе Чэрвень (што рабіў?) ... у вожыкаву схованку, (што зрабіў?) ... у птушыныя гнёзды. Сонейка (што рабіла?) ... яму ва ўсім.

5. Спішы сказы, устаўляючы патрэбныя дзеясловы.

6. Падбяры і запішы дзеясловы паводле ўзору.

пісаў	–	напісаў	рабіла	–	зрабіла
рысаваў	–	.....	варыла	–	.....
чытаў	–	.....	ліла	–	.....
спяваў	–	.....	ела	–	.....
рабіў	–	.....	несла	–	.....
казаў	–	.....	будавала	–	.....
ехаў	–	.....	пісала	–	.....
чытаў	–	.....	малявала	–	.....

Ягады

Які сяголета шчаслівы
І ураджайны выпаў год:
Ва ўсіх садох агрэст і слівы,
Суніцаў повен агарод.
Пустыр закінуты калішні –
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.
А за аселіцай, над рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набракла дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.
А што за ягады лясныя
У нас адразу зацвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разнеслі па зямлі.
Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясох,
За імі следам і чарніцы
Закрасавалі ў верасох.
Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завяззю брусніц.
І ўсе балотныя палянкі
Цвітуць агнямі журавін,
І неўзабаве ўспыхнуць гранкі
Чырвоных, яркіх арабін.
Які сяголета шчаслівы
І незвычайны выпаў год,
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод!

Пятро Глебка



???

1. Якія ягады растуць у агародзе, садзе і ў лесе?
2. Ці любіш есці ягады?

3. Падбяры і запішы адпаведныя прыметнікі.

парэчка (якая?) .....
суніцы (якія?) .....
арабіна (якая?) .....
маліны (якія?) .....

На паляванні

Аж да вечара ад рання
Мы былі на паляванні.
І лісіцу ўпалявалі,
І мядзведзя ўпалявалі,
І сініцу ўпалявалі,
І сароку ўпалявалі,
І варону ўпалявалі,
І цяцерку ўпалявалі,
І вавёрку ўпалявалі
Не ружжом,
Што ёсць у таты, –
Нашым
Ф о т а а п а р а т а м.

Леанід Шырын



1. Пра якое паляванне гаворыць верш?
2. Якіх звяроў «упалявалі» героі верша?

3. Запішы назвы гэтых звяроў у алфавітным парадку.
4. Складзі сказы з запісанымі назвамі звяроў.

5. Ці цікавіць цябе фатаграфія?
6. Якія здымкі любіш рабіць або глядзець?

У кнігарні

Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай.
На паліцах – безліч кніг!
Тоўстых, тонкіх – розных самых.
Цэлы свет – у кніжках тых!



– Я куплю табе во гэту...
Гэту й гэту варта ўзяць...
Ты пра ўсе краіны свету
З гэтых кніжак будзеш знаць.

Пра Аўстралію, Аляску,
Чылі, Індыю, Кітай,
Пра Еўфрат во нават казка...
Толькі, сын, бяры чытай.

– О, як добра! Дзякуй, мама!
Я пра іх чытаць люблю.
Толькі б знаць хацеў таксама
Я й пра нашую зямлю.

Пра яе лясы і рэкі,
Пра забытыя гады,
Пра той шлях з вараг у грэкі
І пра казкі-гарады.

І яшчэ – за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне –
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне...

Кастусь Цвірка

???

1. Якія кніжкі хацелі набыць у кнігарні мама і яе сын?
2. За якую кніжку будзе ўдвайне ўдзячны сын?
3. Якія кніжкі хочаш набыць ты? Чаму?

У бібліятэцы



Надзя і Лена пайшлі ў бібліятэку.

У бібліятэцы шмат кніжак. Вялікія паліцы з кнігамі стаяць каля сценаў. Некаторыя кнігі ляжаць на сталох. На вокладках – прыгожыя малюнкі. У пакоі цішыня. За сталамі сядзяць дзеці і чытаюць кнігі, часопісы і газеты. На сценах – партрэты і карціны. Добра ў бібліятэцы. Тут можна даведацца многа новага і цікавага.

Надзя і Лена ўзялі кніжку пра Белавежскую пушчу. Спачатку яны разглядалі цікавыя малюнкі, а потым пачалі чытаць кніжку.

Валянтына Пашкевіч

???

1. Хто пайшоў у бібліятэку?
2. Што стаіць каля сценаў?
3. Што чытаюць дзеці ў бібліятэцы?
4. Якую кніжку разглядалі дзяўчаткі?
5. Чаму варта пайсці ў бібліятэку?

6. Запішы сказы, устаўляючы прапушчаныя словы.

У Беластоку раз у тыдзень выходзіць газета на беларускай мове. Гэта ... пад загалоўкам .... . У гэтай газеце можна пачытаць старонкі для дзяцей і моладзі ... . У Беластоку друкуецца таксама ... на польскай і беларускай мовах ... .

Мілы гном, дзе твой дом?



Бабка баіла Алесю:
Гномаў шмат жыве у лесе.
Маюць цёплыя капоты,
У чырвоных ходзяць ботах
І каптурыках чырвоных.
З мілых тварыкаў натхнёных
Па грудзях плывуць бародкі.
Колькі ж дабраты салодкай
Маюць у вачах блакітных!
З вякоў даўніх, старажытных
Да сягоння жывуць гномы
І не робяць зла нікому.
– Вось каб з гномамі сустрэцца! –
Алесь марыць, мараць дзеці...
Давялося раз Алесю
Пабываць улетку ў лесе.
Углядаецца кругом:
– Мо дзе прытаіўся гном?
Мо дзе глянуць з-пад лісточка
Ясныя малыя вочкі?
Адазвіся, мілы гном,
Дзе жывеш ты, дзе твой дом?
І няўцям яшчэ малому,
Што у казках жывуць гномы.

Віктар Швед

???

1. Пра каго расказвала Алесю бабка?
2. Як выглядаюць гномы?
3. Дзе жывуць гномы?

4. Намалюй партрэт гнома.



1. Прачытай інфармацыю пра Віктара Шведа.

Віктар Швед нарадзіўся ў вёсцы ..., што на ... . Ён – аўтар ... для дзяцей і дарослых. Да многіх з іх склалі ... . Выдаў каля .... зборнікаў сваіх твораў.

2. Дапоўні яе і запішы ў сшытак.

3. Пачытай і паслухай іншыя вершы Віктара Шведа. Можаш пакарыстацца дыскам «Васількі-валошкі».

4. Выберы адзін са зборнікаў вершаў Віктара Шведа і запішы інфармацыю пра яго.

Аўтар: ..... Ілюстратар: .....

Назва зборніка: .....

5. Вывучы выбраны табой верш на памяць.

Дзе Антося?

Янка малы. Ходзіць у садок. Антося вялікая. Яна ходзіць у трэці клас. Янка ведае, што Антося нашмат за яго мудрэйшая. Мама пацяшае Янку, што праз тры гады і ён будзе такі самы разумны.

У школе будзе спектакль. Антося будзе выступаць, а Янка – не. А чаму? Бо Антося ўмее чытаць і сама можа навучыцца ролі.

Але Янка не сумуе, бо Антося яму сказала:

– Затое ты будзеш глядзець на спектакль, а я – не. І ты ўсё ўбачыш. Я схаваюся за сцэнай і толькі тады пакажуся, калі буду патрэбная.

Дык Янка цешыцца, што ён усё ўбачыць. Ён вельмі цікавіцца, кім будзе Антося. Але Антося не хоча казаць. Гэта таямніца.

Урэшце прыходзіць тая нядзеля і той спектакль. Янка сядзіць у першым радзе між дашкольнікамі.

На сцэне рухаюцца розныя дзівосныя стварэнні. Спяваюць, танцуюць і нешта расказваюць. Янка не вельмі ўважае.

Ён цікуе, дзе Антося.

Не можа яе знайсці. Усе кветкі ўжо пазнаў. Гэта Галя, гэта Эля, гэта Марыся. Антосі няма.

Танцуюць кветкі, скачуць грыбы. Грыбы – гэта хлопцы. Антосі нідзе не відаць.

Цяпер на сцэну – кляп, кляп – уваходзяць дзве зялёныя жабы. Але твараў не відаць – заслоненыя жабінымі смешнымі маскамі. Крэкчуць, кумкаюць.

Янка ўжо нецярплівіцца. Дзе ж гэта Антося? Ці яе не пусцяць на сцэну?

– Антося! – крычыць ён.

– Ціха! – звяртаецца да Янкі адна жаба. Янка ўжо ведае! Антося – жабаю! Пазнаў па голасе.

Паводле Валянтыны Пашкевіч

???

1. Хто герой гэтага апавядання?
2. Чаму Антося прымала ўдзел у спектаклі, а яе брат не мог?
3. З чаго цешыўся Янка?
4. Чаму Янка не мог пазнаць сястру?

???

5. Ці ты любіш хадзіць у тэатр? Чаму?

Білеты ў цырк



У горад прыехаў цырк. Маці дала Кастусю грошы і сказала:

– Сёння ў 12 гадзін пойдзем у цырк. Купі два білеты. Адзін мне, другі – сабе. Потым строга дадала: – Глядзі ж, не баўся.

Праз якія паўгадзіны радасны Кастусь ужо імчаўся дадому, сціскаючы ў руцэ дзве сіненькія паперкі.

Усюды ў горадзе віселі цыркавыя афішы. Каля адной з афіш Кастусь спыніўся. На ёй быў цікавы малюнак: белыя сабачкі стаялі ў рад і пярэднімі лапкамі віталі мядзведзя. Як многа цікавага ўбачыць Кастусь сёння ў цырку!

Нейкі дзядзька, праходзячы міма, штурхануў хлопчыка ў плячо.

– Не бачыце, ці што? – сярдзіта сказаў Кастусь.

Дзядзька спыніўся, павярнуўся назад. На вачах у яго былі акуляры з сінімі шкельцамі, у руках ён трымаў жалезную кульбу.

– Прабач, хлопчык, – ціха прамовіў ён. Памацаўшы кульбай вакол сябе, дзядзька асцярожна зрабіў некалькі крокаў.

«Сляпы», – здагадаўся Кастусь. Сляпы ішоў проста ў лужу.

– Дзядзька, вада там! – крыкнуў Кастусь.

Сляпы збочыў управа і наткнуўся на паркан.

– Паркан! – зноў крыкнуў хлопчык. Ён падбег да сляпога, узяў яго за руку, вывеў на дарогу і спытаў:

– Вам далёка ісці?

– На вакзал.

– О! – здзівіўся хлопчык. – Як жа вы дойдзеце?

– Як-небудзь.

Не выпускаючы рукі сляпога, Кастусь вёў яго спачатку па тратуары, потым па скверы. А калі дайшоў да плошчы, Кастусь спыніўся. Тут яму трэба было зварочваць дадому, а дарога на вакзал ішла налева.

– Я, дзядзька, сёння ў цырк пайду, – сказаў Кастусь, – мяне мама чакае. Бывайце.

– Бывай. Дзякуй табе.

Кастусь пабег. Ужо ля самога дома ён азірнуўся і ўбачыў, што сляпы стаіць на тратуары і ніяк на асмельваецца перайсці плошчу. Машыны ішлі ды ішлі бясконцым патокам. Грузавыя і легкавыя, тралейбусы і аўтобусы. А сляпы ўсё стаяў і нецярпліва пастукваў кульбай. «Ён адзін не пяройдзе, – падумаў Кастусь, – трэба дапамагчы».

Кастусь падбег да сляпога і зноў узяў яго за руку.

Сляпы пазнаў хлопчыка, моўчкі кіўнуў галавой і пакрочыў следам за ім.

Васіль Хомчанка

1. Куды пайшоў Кастусь?
2. Каго спаткаў хлопец?
3. Як Кастусь дапамог сляпому?
4. Чаму вучыць гэтае апавяданне?

5. Чаму трэба дапамагаць адзін аднаму?
6. Ці здарылася табе дапамагчы каму-небудзь?
7. Як ты сябе адчуваў, дапамагаючы іншым?

8. Зрабі плакат-афішу з заклікам дапамагаць адзін аднаму.

Смачны сон

Сніўся Пецю смачны сон:
На батоне ехаў ён.

Лётаў Сцёпка на бліне,
як на цуда-дыване.

Цыркачом Сымон да ганку
Прыкаціў на абаранку.

Кліма ўзняў аж на аблок
Дырыжабль-агурок.

Паддаваў Мікіта пары:
Бег цягнік за самаварам.
Як вагоны – булкі-плюшкі,
А замест білетаў – сушкі.

Ды галодны бег Дзяніс –
Паўбатона ўміг адгрыз.

А пасля – зблажэў зусім:
Абаранак раскусіў.
А ў дадатак, на закуску,
Агурком Дзяніс захрускаў.

Да бліна не дацягнуўся,
Блін у рукі сам вярнуўся:
Апусціўся, бо дачасна
У ім без масла
Цяга згасла.

Толькі чаю не папіў,
Бо Мікіта затрубіў.

Тут і Пеця прахапіўся,
Смачны сон перапыніўся.



Васіль Зуёнак

???

1. Чаму верш мае загаловак «Смачны сон»?
2. Які настрой верша? Чаму?

3. Запішы сказы ўпісваючы прапушчаныя словы.

Пецю ..... сон. Ён ..... на машыне.
Сцёпка ..... на бліне.
Сымон ..... на абаранку.
Кліма ..... агурок.
Цягнік ..... за самаварам.
Дзяніс ..... паўбатона і ..... абаранак.
Мікіта ..... .

4. Спішы. Устаў словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў.

Мама ..... ежу. Тата ..... посуд. Ася ..... падлогу. Коля ..... абутак. Дзядуля ..... газету. Бабуля ..... кветкі. Настаўніца ..... урок.

5. Хто або што выконвае гэтыя дзеянні?

Ідзе	Ляціць	Бяжыць ..... .
Скача	Коціцца	Ляжыць ..... .
Плавае	Едзе	Шуміць ..... .

6. Змяні словы так, каб яны абазначалі дзеянні. Запішы.

пісьмо	–	пісаць	чырвоны	–	чырванее
абед	–	.....	хворы	–	.....
сябар	–	.....	цёмны	–	.....
корм	–	.....	вечар	–	.....

7. Прачытай сказы, устаўляючы на месцы кропак адпаведныя дзеясловы.

Кася (што рабіла?) ..... цікавую кніжку пра звяроў.
Славік (што зрабіў?) ..... цікавую кніжку пра звяроў.
Данік і Якуб (што робяць?) ..... па калідоры.
Аня і Ксеня (што рабілі?) ..... маме карціну.
Хлопцы (што будуць рабіць?) ..... вясёлыя песні.
Дзяўчаткі (што зробяць?) ..... у горы.
Дзеці (што зрабілі?) ..... у сваім пакоі.

Апошні дзень у школе



Апошні дзень у школе! Сёння ўсе яшчэ сядзяць на сваіх лаўках, але ўжо заўтра пачынаюцца сапраўдныя вакацыі.

Настаўніца толькі што раздала граматы. Яны ляжаць цяпер на партах. Ужо можна было б развітацца і пайсці дадому, але неяк ніхто не спяшаецца.

– Такі сёння прыемны дзень, – сказала Юльянка.

– Ну, пэўна! – згаджаецца Валодзя. – Гэта ж заўтра вакацыі.

– Але не толькі таму, – кажа Юльянка. – Сёння канчаецца навучальны год. Усе мы атрымалі добрыя пасведчанні. А помніце, як мы яшчэ нядаўна баяліся канца навукі і пасведчанняў?

– Лявон хварэў, і мы думалі, што ён не здасць у чацвёрты клас.

– У мяне была двойка па матэматыцы.

– За першае паўгоддзе шмат у каго былі кепскія адзнакі.

– Але мы добра ўзяліся за навуку.

– Мы памагалі слабейшым.

– І цяпер усе перайшлі ў чацвёрты клас. Ніхто не застаўся на другі год. І таму сапраўды вельмі прыемна, – кажа Юльянка.

– Праўда? – звяртаецца яна да настаўніцы.

– Але, Юльянка, – кажа настаўніца. – Сёння радасны дзень для ўсяго класа. Наша супольная праца дала добрыя вынікі. Мы выканалі сваё заданне. І таму адпачынак будзе яшчэ больш прыемным. Вы заслужылі на вясёлыя і бесклапотныя вакацыі.

А праз два месяцы сустрэнемся ў чацвёртым класе.

– І адразу возьмемся добра за навуку, – абяцаюць дзеці. – Каб ад пачатку года мець такія самыя радасныя дні, як сёння!

Паводле Валянтыны Пашкевіч

1. Прачытайце тэкст з падзелам на ролі.

2. Пра што гаварылі вучні?

3. Якія былі іхнія абяцанні?

4. Раскажы пра свае планы на час вакацыяў. Дзе ты іх хочаш правесці? Чым будзеш займацца?



разгледзь, знайдзі



адкажы на пытанні



вывучы



раскажы, назаві, растлумач



прачытай



запішы



намалюй

Змест

Я ЎЖО ТРЭЦЯКЛАСНІК

За вучобу 3
Пасля канікулаў 4
Ветлівыя словы 5
Давайце пазнаёміцца 6
Дарога ў школу 7
Школьныя прылады. Назоўнік 8
Дружны клас 10
Выбары старасты 11
Абавязкі вучня 12
Робат 13

ВОСЕНЬ ГАСПАДЫНЯ

Надыход восені 14
Восень шыла фартушок 15
Закружыліся лісточкі 16
Думкі 17
У грыбох 18
Ядомыя грыбы 19
Як людзі навучыліся есці бульбу 20
Гаспадарыла сонца на градках 21
Чаму цыбуля горкая 22
Яблыкі 23
Лістапад 24
Дзяды 25

Я І МАЯ СЯМ'Я

Твой род, твая Радзіма 26
Радаслоўнае дрэва 27
Праца нашых бацькоў 28
Прафесіі 29
Нашыя хатнія абавязкі 31
Асабістая гігіена 32
Мой распарадак дня 33
Працавіты тыдзень 35
Смачна есці 36
Сядаем за стол 37
Нашае меню 38
Новы дом 39
Мой пакой 40
Наваселле 41

ЭХ, ТЫ ЗІМАЧКА, ЗІМА

Ляцяць сняжынкі 42
Чараўніца зіма. Прыметнік 43
Як я пазнаю свет 45
Дзеяслоў 46
Хто як зіму сустракае 47
Цецерукі на бярозах 48
Ляціце, птушкі, да нашай 50
Мяцеліца 51

ЗІМОВЫЯ СВЯТЫ

Год ахвочы да прыгод 53
Дванаццаць птушак 55
Каляды 56
Нарадзіўся Божы Сын 57
Коледа! 58
Васілёва маці пошла гоготаці 59
Бабулі 60
Гузік 61

ЗІМОВЫЯ ГУЛЬНІ

Лыжы 62
На санках 64
Лепім снегавіка 65
Род назоўніка 66
Словы на снезе 67
Люты 69
Хто самы дужы 71
Нашыя вопратка і абутак 73

НАШАЕ МІНУЛАЕ

Гісторыя 75
Адкуль Тыневічы 76
Горка ля Новага Беразова 77
Пра камень у Валілах 79
Апостраф 80
Полацк 81
Наша першая дзяржава 82
Род назоўніка і прыметніка 83
Усяслаў Чарадзей 84
Пра герб і сцяг 85

ГУКАННЕ ВЯСНЫ

Гуканне вясны 87
Красавік 88
Антонімы 90
Вясна 91
Фіялка 92
Пралеска 93
Дзеці на парашутах 94
Хадзіла вярба 96
Вялікдзень 97

СВЕТ ЗВЯРОЎ І ПТУШАК

Травень 98
Хто які голас падае? 99
Бусел верны Беларусі 100
Добры дзяцел 102
Сарока-манюка 104
Зубры ў Белавежскай пушчы 106
Свойскія жывёлы 107
Жыў-быў вожык 108
Дзікі 109

ЯКІЯ МЫ ДЗЕЦІ

Мама 111
Якія кветкі падараваць маме 112
Чэрвень і Сонейка 113
Ягады 115
На паляванні 116
У кнігарні 117
У бібліятэцы 118
Віктар Швед – беларускі паэт 119
Дзе Антося 121
Білеты ў цырк 122
Смачны сон 124
Апошні дзень у школе 126